# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №6 (34) (верасень)

www.litbel.org www.novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


«НАВІНЫ»: асноўныя падзеі літаратурна-грамадскага жыцця верасня ... 2

«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Ірыны ХАДАРЭНКА і Усевалада СЦЕБУРАКІ ... 3

«ЗАПІСЫ»: «Неўпарадкаваныя нататкі» Ніла ГІЛЕВІЧА ... 4–5

«ПАМЯЦЬ»: лісты Ларысы ГЕНІЮШ і эсэ Генрыха ДАЛІДОВІЧА пра Наталлю АРСЕННЕВУ ... 6

«КНІГАРНЯ»: рэцэнзія Анатоля ІВАШЧАНКІ на кнігу Віктара КАЗЬКО «Дзікае паляванне ліхалецця» ... 7

«КАЛЕЙДАСКОП»: пісьменніцкія прызнанні, знаходкі ды анонсы новых кніг ... 8


ПАЗІЦЫЯ

# НУ І НЮ. ГОЛЫ КАНФАРМІЗМ

**Алег АБЛАЖЭЙ**

**Хто цяпер паверыць: былі часы, калі людзі стаялі начамі ў чэргах па кнігі. А цяпер дзеці тых «стоікаў» выварочваюць цэлыя бібліятэкі на сметнікі. Канец слова?**



Менавіта так названы «праект» са здымкамі голых беларускіх літаратараў. Адчайная спроба хоць як звярнуць на сябе ўвагу. Так закаханы падлетак гатовы на самыя недарэчныя выбрыкі — абы ягоная Дульсінея азірнулася. Сяго-таго літаратары дамагліся — пра іх учынак спрачаюцца больш, чым пра іхнія тэксты. Якіх, паўторым, не чытаюць.

«То мо цяпер...» — спадзяюцца. Што ж, сучасным светам кіруе маркетынг, рэклама. Калі Маякоўскі марыў — «чтобы после работы завком закрывал мои губы замком», — гэта зусім не была туга па цэнзуры ці якім-небудзь «Совету по нравственности». Проста паэт хацеў стаць удзельнікам агульнага вытворчага працэсу. Вось і літаратары задумалі стаць шараговымі ўдзельнікамі маркет-шоу. І звярнуць на сябе ўвагу такім жа чынам, як гэта робяць вытворцы калготак і пракладак. Бо літаратура ўрэшце рэшт — тавар...

Многія таленты намагаліся «быць як усе» — бо на п'едэсталах холадна і няўтульна. Леў Талстой спрабаваў араць зямлю і шыць боты, Ван Гог марыў упрыгожваць сваімі творамі пакоі звычайных людзей, Павел Філонаў намагаўся верна служыць пралетарыяту. Але жыццё груба вяртала іх на свае месцы — вы ніколі не будзеце «часткаю нас», вы асуджаны быць «па-за». Дыхатамія «паэт і чэрнь» — вечная. І балючая.

Але калі паэт лісліва зазірае чэрні ў вочы — ён перастае быць паэтам. Нельга мастаку віляць хвастом — рукі будуць дрыжэць. Прырода таленту — самота. Бо нязведанымі сцяжынкамі ходзяць паасобку.

Творцам даруецца многае — п'янства, няшлюбныя дзеці і нават прыслужванне ўладам. Але ніколі, ні пры якіх абставінах, не даруецца смяртэльны для творцы грэх — банальнасць. Не ў тым бяда літаратараў, што яны распрануліся. Бяда, што яны зрабілі гэта не першымі. Нават не дзесятымі і не сотымі. Цяпер загольваюцца ўсе: поп і рок-зоркі, цэлыя рэдакцыі «гламурных» часопісаў і нават палітыкі. Інтэрнэт стракаціць голымі цыцкамі і дупамі. «У Лолиты вывалилась грудь», «Жанна Фриске показала «киску». Беларускі пісьменнік НН паказаў «піську».

Стаў у шэрагі.

«Он так же мал и мерзок, как мы!». Скажаце — гэта ж не болей, чым жарт! Іронія.

Іронія нагадвае кіслотнасць страўніка. Забяспечвае жыццядзейнасць — але калі яе зашмат, губіць арганізм. Так вырадзілася ў кіч смяртэльна паважная акадэмічная культура XIX стагоддзя. Невыносна чытаць большасць сучасных «патрыятычных» тэкстаў. Але конскія дозы іроніі непазбежна перарастаюць у цынізм, згубны для творцы горш любога наркотыка.

Так — літаратура таксама тавар. Але тавар асаблівы. Як хлеб. А задача хлеба — насыціць, а не здзівіць ці ашаламіць. Не так даўно людзі запаўнялі стадыёны, бо прагнулі паэтычнага слова як хлеба. А потым паэты сталі класці ў працягнутыя рукі нават не каменні, а свае «вершаванітаванні». То што крыўдзіцца, калі рукі больш не працягваюць? Не шоку, не эпатажу трэба цяпер, а ўцямнага, людскага слова. Якое дапамагае жыць. І пагэтаму — вечнае. А калі кнігу немагчыма чытаць ні ўздоўж, ні ўпоперак, ні па дыяганалі — ніякі аўтарскі стрыптыз не дапаможа.

Бо сам тэкст бязлітасна агольвае не цела — нутро аўтара. Распранаючыся, пісьменнік намагаецца прыкрыць творчую няўпэўненасць. Калі не імпатэнцыю.

Найлепшая маска канфарміста — маска бунтара. Асабліва калі бунт дазволены.

А ўвогуле гэта гісторыя заўтра-паслязаўтра забудзецца. І тэксты Акудовіча застануцца тэкстамі Акудовіча — будзем мы яго бачыць у кашулі ці без.

Як і тэксты літаратара, што выразаў на грудзях сваё імя...

**http://naviny.by**

## ПАЛІЦА

### САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ ЗАСНАВАЎ КНІЖНА-ВЫДАВЕЦКУЮ СЕРЫЮ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ, ПАЭЗІІ І ДРАМАТУРГІІ «КНІГАРНЯ ПІСЬМЕННІКА»

У серыі выйшла тры кнігі: проза Уладзіміра Някляева «Цэнтр Еўропы», прыгодніцкі раман Кастуся Цвіркі «Воўчая выспа» і эсэістыка Віктара Казько «Дзікае паляванне ліхалецця».

Неўзабаве з'явяцца «Анталогія маладога беларускага жаночага апавядання» і гістарычны раман Вольгі Іпатавай «Знак вялікага магістра», які распавядае аб знакавых падзеях беларускай дзяржаўнасці ў эпоху князя Вітаўта.

Аб набыцці кніг серыі «Кнігарня пісьменніка» можна даведацца па тэл.: (Velcom) 637-66-43; (МТС) 274-85-97.




**Уладзімір Някляеў. Цэнтр Еўропы: апавяданні, аповесці. — Мінск: «Кнігазбор», 2009. — 248 с. (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»).**

Проза Уладзіміра Някляева, як і ягоная паэзія, адметная псіхалагізмам, вастрынёй адчування і глыбінёй асэнсавання часу.

У новую кнігу ўвайшлі напісаныя ў замежжы і па вяртанні з эміграцыі апавяданні «Бомба», «Юзік», «Цмок», «Музей Броўкі…», «Залатая Арда» ды інш., а таксама аповесці «Вежа», «Няхай жыве 1 Мая!», «Прага», «Мірон ды Мірон» і «Вяртанне Веры».




**Кастусь Цвірка. Воўчая выспа: раман. — Мінск: «Кнігазбор», 2009. — 248 с. (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»).**

Пры спрыяльных умовах раман мог бы чакаць лёс гісторыка-серыяльнага кінатрылера. Душэўна спляліся тут многія сюжэтныя лініі ад Маўглі да «Людзей на балоце» — і арганічна скандэнсаваліся ў захапляльнае чытво з нацыянальным пафасам і мастакоўскім болем за лёс свайго паднявольнага колісь краю і народу. ...Раскулачаны Ігнась Караленя ўцякае з Сібіры і вяртаецца да жонкі і дзяцей у забалочаную вёску. Аднаго з сыноў-блізнятак украў і знёс у лес воўк... Сам гаспадар мусіць уцякаць ад пераследу энкавэдыстаў, пасля чаго сустракаецца з сынам.

А ваўкі аказаліся лепшымі за людзей...




**Віктар Казько. Дзікае паляванне ліхалецця: эсэ, публіцыстыка. — Мінск: «Кнігазбор», 2009. — 360 с. (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»)**

Новая кніга вядомага беларускага празаіка складзена з эсэістыкі і публіцыстыкі апошніх гадоў. Вось толькі некаторыя іх назвы, якія яскрава сведчыць і пра змест: «Азвярэнне, амаль Крамлёўская гісторыя», «Дзікае паляванне каралёў сталіншчыны», «Абуджэнне памяці», «Так на Беларусі хаваюць пракрокаў», «Зазірнуць у вочы свайму Я», «Я вам ніколі не схлусіў» і інш.

Вастрыня і надзённасць, боль за родную зямлю і краіну, мову і культуру — адметнасць кнігі, як і ўсёй творчасці Віктара Казько.

## МЕСЯЦАСЛОЎ

### ФУРОР МЕСЯЦА

9-12 верасня на знакамітым польскім курорце «Крыніца», што пад Кракавам, праходзіў XIX Еўрапейскі эканамічны форум, у якім бралі ўдзел каля 500 вядучых эканамістаў і палітыкаў з усяго свету.

У культурнай праграме гэтага прадстаўнічага мерапрыемства выступіў беларускі паэт Уладзімір Някляеў. «Паслухаўшы бліскучага беларускага паэта, я сам стаў трошкі беларусам», — выказаў сваё ўражанне ад літаратурнай вечарыны Уладзіміра Някляева знаны польскі палітык Уладыслаў Сакалоўскі.

Апроч Уладзіміра Някляева, які, як напісалі арганізатары форуму, «з'яўляецца не толькі паэтам і празаікам, але і паслом беларускай літаратуры», для ўдзелу ў культурнай праграме былі запрошаныя ангельскі пісьменнік і гісторык, аўтар бестселера «Паўстанне 44» Норман Дэвіс, вядомы нямецкі палітычны дзеяч, аўтар кнігі «Праект — пашырэнне» Гюнтэр Ферхойген і расейская літаратарка Марыя Арбатава.

З песнямі на вершы Уладзіміра Някляева выступіў на ягонай вечарыне Зміцер Вайцюшкевіч. Абодва яны, беларускі паэт і беларускі спявак, атрымалі запрашэнне для ўдзелу ў фестывалі «Варшаўская восень» — міжнародным свяце паэзіі.

### ФЕСТЫВАЛЬ МЕСЯЦА




З 9 па 13 верасня ў польскім горадзе Вейцбарк адбыўся VI Міжнародны фестываль паэзіі «Pobocza 2009», у якім узялі ўдзел каля трыццаці паэтаў з Польшчы, Славеніі, Чэхіі, Славакіі, Венгрыі, Украіны. Беларусь на форуме прадстаўлялі Эдуард Акулін, Леанід Дранько-Майсюк і Барыс Пятровіч. У межах фестывалю адбыўся шэраг паэтычных сустрэч у гімназіях, ліцэях, школах і бібліятэках Вейцбарка, Семпульнага Краю і Быдгашчы з прэзентацыяй творчасці ўдзельнікаў фестывалю. Пад час паэтычных спатканняў была арганізаваная дыскусія на тэму: «Паэзія — узбочына ці цэнтр культурнага жыцця Еўропы».

Па выніках фестывальных дзён выйшаў паэтычны альманах «Pobocza» з творамі яго ўдзельнікаў у перакладзе на польскую мову.

### ВЫСТАВА МЕСЯЦА

15 верасня ў Мінску ў мастацкай галерэі кафэ «Добрыя мыслі» адкрылася фотавыстава Яўгенія Коктыша, прысвечаная пісьменніку, літаратуразнаўцу і грамадскаму дзеячу Алесю Адамовічу (1927–1994).

У экспазіцыі дэманструецца 43 працы, якія выяўляюць А.Адамовіча ў паўсядзённыя і ўрачыстыя моманты жыцця ў 1970-1990-х гадах.

У адкрыцці выставы прынялі ўдзел вядомыя дзеячы нацыянальнай навукі і культуры, у тым ліку пісьменнікі Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Сяргей Законнікаў, Уладзімір Някляеў, доктар філалагічных навук, прафесар Міхась Тычына.

У сваіх выступленнях сябры і калегі А.Адамовіча адзначалі ў працах Я.Коктыша «высокую інтуіцыю майстра фіксаваць самыя сакральныя і важныя імгненні ў паводзінах чалавека і ў яго адносінах з людзьмі».

Выстава дзейнічае да 30 верасня.

### КНІГА МЕСЯЦА

У выдавецтве «Кнігазбор» выйшаў том выбраных твораў народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча — 48-ы том серыі «Беларускі кнігазбор». У 600-старонкавае ілюстраванае выданне ўвайшлі найбольш значныя творы розных жанраў беларускага паэта, літаратуразнаўца, фалькларыста, перакладчыка і грамадскага дзеяча: вершы, паэмы «Заручыны» і «Лодачкі», раман у вершах «Родныя дзеці», аўтабіяграфічная аповесць «Перажыўшы вайну», эсэ аб выдатных дзеячах літаратуры і публіцыстыка. Сярод публіцыстычных твораў — найболей вядомыя выступленні Ніла Гілевіча ў абарону беларускай мовы, нацыянальнай гісторыі і культуры, у тым ліку 1990-1996 гадоў, калі ён узначальваў пастаянную камісію Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны.

Уступны артыкул да зборніка напісаў доктар філасофскіх навук Уладзімір Конан.

Выданне паступіла ў кнігарні краіны, кошт — каля 28 тыс. рублёў.

### СУСТРЭЧА МЕСЯЦА

17 верасня ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася творчая сустрэча з народным паэтам Беларусі Рыгорам Барадуліным «Паслаць маме душу…». У рамках мерапрыемства прэзентавалася ўнікальнае выданне «Паслаў бы табе душу…» (ліставанне Рыгора Барадуліна з мамай (1954–1971), выдавецтва «Лімарыус».

### «ІМЁНЫ» МЕСЯЦА

«Усё па-ранейшаму толькі імёны зьмяніліся» — такую назву мае новы зборнік вершаў Уладзімера Арлова, які выйшаў у серыі «Кнігарня «Наша ніва» ў выдавецтве І.П.Логвінава. Гэта пранікнёная кніга-забаўка ў сур'ёзнай абгортцы. Ці наадварот: спавядальныя роздумы падчас хады па верлібравых радках-прыступках.

Шматлюдная прэзентацыя кнігі з удзелам аўтара адбылася 18 верасня ў Мінскай сядзібе ТБМ.

ПАДЗЕІ

# «СУПОЛЬНАЯ» ПРЭМІЯ ІМЯ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

**З 10 па 13 верасня ў Львове (Украіна) прайшоў Міжнародны кніжны кірмаш, у якім прынялі ўдзел каля тысячы выдаўцоў, а наведалі — больш 70 тысячаў чытачоў. Свята кнігі адкрыў прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка. Ладзіліся сотні прэзентацый новых кніг з удзелам аўтараў.**

У межах Міжнароднага кніжнага кірмашу адбылася сустрэча старшыні СБП Алеся Пашкевіча з Радай Львоўскай арганізацыі Нацыянальнага саюза пісьменнікаў Украіны (старшыня Марыя Якубоўская). Саюз беларускіх пісьменнікаў і Львоўская арганізацыя НСПУ (налічвае больш 160 членаў) заснавалі супольную Міжнародную прэмію імя народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова. Лаўрэатам першай прэміі стала беларускамоўная пісьменніца Ніна Турбал (Украіна) — за ўмацаванне міжнародных літаратурных стасункаў, наладжванне творчых кантактаў паміж Украінай і Беларуссю, актыўную літаратурную працу і кнігу «Зямны паклон».

# ФОРУМ ВЫДАЎЦОЎ

**У Вільні, сёлетняй культурніцкай сталіцы Еўропы, адбыўся форум, падчас якога шведскія і беларускія выдаўцы, рэдактары і літаратары мелі магчымасць абмяняцца вопытам, абмеркаваць надзённыя працоўныя і творчыя пытанні.**

Праца форума праходзіла ў форме адкрытых семінараў на шведскай і беларускай мовах. Падчас дыскусій уздымаліся пытанні, якія хвалююць творцаў і вытворцаў. Гэта агульная літаратурная сітуацыя і пануючыя структуры выдавецкай дзейнасці, выбар пісьменніка і твора ў працы выдавецтва, эканамічны і адміністратыўны бок дзейнасці выдавецтва, рэдактарская праца і графічны дызайн, маркетынг, распаўсюд выданняў, новыя медыі і перспектывы на будучыню.



Фота аўтара

Беларускі бок прадстаўлялі Барыс Пятровіч (Саюз беларускіх пісьменнікаў і часопіс «Дзеяслоў»), Уладзімір Сіўчыкаў (Беларускі ПЭН-цэнтр і выдавецтва «Радыёла-плюс»), Зміцер Колас (Выдавецтва «Зміцер Колас»), Аляксандра Дынько (выдавецтва «Логвінаў»), Алена Макоўская (ЗБС «Бацькаўшчына»), Міхась Башура (выдавецтва «Галіяфы»), Людміла Малевіч (выдавецкі аддзел ЕГУ), а таксама Ірына Віданава і Сяргей Сахараў (мультымедыйнае выданне «34»).

Працаю форума апекаваліся Юдыт Блэк (Шведскі Інстытут), каардынатар Нільс Хокансан (выдавецтва «Руін») і мадэратар Пэр Бергстрэм (выдавецтва «Рамус»). Удзельнікі форума мелі і культурніцкую праграму, пачуваліся як у Эдэме, маючы ў сваіх шэрагах Адама і Еву — Адама Персана (выдавецтва «Хёльстрём») і Еву Стэнберг (выдавецтва «Ордфронт»).

**Алеся Сіўчыкава**

РЭПАРТАЖ

# «ГАЛІЯФСКАЕ ТРОХКНІЖЖА»

**Не выдавецтва робіць аўтараў, а аўтары — выдавецтва. Да такой высновы можна было прыйсці падчас прэзентацыі новых кніг незалежнага выдавецтва «Галіяфы», якое 16 верасня запрасіла сваіх чытачоў на прамоцыю свайго «другога фронта мастацтваў»: трох кніг сучаснай беларускай прозы і паэзіі «Анёлак і я», «Піліпікі» і «Вітражы» адпаведна аўтарства Леаніда Дранько-Майсюка, Барыса Пятровіча і Эдуарда Акуліна.**


Фота аўтара

«Новакніжнікаў» віншуе Уладзімір Арлоў

Распачаў вечарыну Уладзімір Някляеў — і абдарыў «кніжных юбіляраў» па букету шчырых кампліментаў. Уладзімір Арлоў прачытаў верлібр аб тым, як важна «не баяцца нікога, у тым ліку і самога сябе». Міхась Скобла прапанаваў свой пераклад верша Канстанты Ідэльфанса Галчынскага «Новы часопіс» — як «завочнае» прысвячэнне выдаўцу «Дзеяслова» Барысу Сачанку-Пятровічу. Анатоль Вярцінскі агучыў хроніку лепшых выданняў «Галіяфаў». А Алесь Пашкевіч выказаў абурэнне, што тры кнігі-прэзентанты фармату 140 на 65 міліметраў падчас вечарыны многія называюць малымі кнігамі. Малых кніг не бывае, адзначыў ён. Прасцей напісаць аб'ёмную кнігу, чым укласці свае думкі і пачуцці ў кнігу нятоўстую. І згадаў «захаляўныя» вершы ды «Кабзар» Тараса Шаўчэнкі. І прапанаваў называць новыя кнігі «Галіяфаў» случанска-акадэмічнымі (паколькі галоўныя супрацоўнікі Зміцер Вішнёў і Міхась Башура — са Случчыны, а адказны за выпуск серыі — акадэмік Нацыянальнай акадэміі Навук Беларусі Уладзімір Гніламёдаў).

Сэрцавінай вечарыны сталі выступленні саміх аўтараў. Леанід Дранько-Майсюк чытаў «трылогію» з вершаў пра каханне (мужчын і жанчын), Барыс Пятровіч — некалькі піліпікаў з аднайменнай кнігі, а Эдуард Акулін дарыў «вітражныя» вершы ды новыя песні.

**Антось Фомчанка**

# НАША ЭРА

Ірына ХАДАРЭНКА

* * *

*Адпачывай, пакуль смяецца поўня.*
*На востраве вастрацца кіпцюры…*
*Паветра расквітнее на жароўні,*
*Калі натоляць прагу ўладары.*

*Васьмёра карлікаў валтузяць футравіну,*
*Лязом кранаючы патончаны прасцяг.*
*Самота тоесная вузкай дамавіне*
*Ад імавернасці да вечнасці наўсцяж.*

*Адпачывай — віжуе паляўнічы,*
*Высмоктваючы адпаведны час.*
*А тыя, што пануюць таямніча,*
*Ужо даўно стварылі твой абраз.*

* * *

*Краіна, вартая любові,*
*Дзяржава, вартая вайны…*
*Чаму згадзіліся, панове,*
*Надзець на ногі кайданы?*

*Сваіх багоў нашто зракліся,*
*А трон чужынцам аддалі?*
*Цяпер нясе, нібыта лісце,*
*Нас вецер часу ўздоўж раллі.*

*Ралля спустошана бясплоддзем,*
*Традыцый сохнуць карані.*
*Чаму не можаш, мой народзе,*
*Сябе ад здзеку бараніць?*

*Узровень годнасці скаціны*
*Вышэй людскога ў сто разоў,*
*Калі халуйства павуціннe*
*Звісае нават з абразоў.*

*Амаль пазбаўленая мовы,*
*З душой, здранцвелай ад маны,*
*Краіна — вартая любові,*
*Дзяржава — вартая вайны.*



* * *

*Звярыныя вочы з-за кратаў за мной назіраюць;*
*Жалезная сетка паўстала між намі мяжой…*
*А вочы ўсё сочаць, маўкліва мяне дакараюць;*
*І я незваротнасць быцця адчуваю душой.*

*Лаўлю гэты позірк, і думкі пульсуюць у скронях,*
*Што людзі палююць за глупствам, марнуюць свой час,*
*і свет наш — звярынец, мы самі жывем у палоне,*
*таму нават злоўлены звер — больш свабодны за нас.*

## ЕССЕ НОМО

*Вось — просты чалавек, кавалак біямасы*
*І будучы жыхар драўлянае труны.*
*Ці здольны ён спазнаць, застаўшыся сам-насам,*
*Як брыдка існаваць за кратамі маны?*
*Ці можа ён адчуць у гонцы мітуслівай,*
*Што гэта зноў над ім смяецца небасхіл?*
*Гадуйся, чалавек!*
*Ты ў невуцтве шчаслівы;*
*Учора эмбрыён, а заўтра — толькі пыл.*

## ГОРАД-220

***Лишь тот, кто мыслит, — тот народ,***
***всё остальное — населенье.***
***Я. Яўтушэнка***

*Замшэла-шэрыя дамы*
*Глядзяць вачніцамі пустымі…*
*Сярод бяскрылых і нямых*
*Студнее розум, сэрца стыне.*

*Тут лепш маўчаць, чым гаварыць.*
*Тут не жывуць, а выжываюць.*
*Замест герояў — махляры,*
*Замест асоб — сляпая зграя.*

*Так дзень за днём, за годам год*
*Блукаю я ў драпежным змроку.*
*Куды падзеўся мой народ?*
*Адно насельніцтва навокал…*

* * *

*Мая нацыя ў стане стагнацыі.*
*Мая мова жыве ў сутарэннях.*
*Не, ніколі не можа мець рацыі*
*Большасць прагнучых самазнішчэння,*

*Большасць тых, хто з усім пагаджаецца,*
*Большасць тых, хто натоўпы стварае,*
*Большасць тых, хто і ноччу, і раніцай*
*Марыць прыпаркавацца да раю.*

*Тая большасць завецца тутэйшымі,*
*Памяркоўнасць ім служыць пасагам;*
*І пасуцца яны па-ранейшаму*
*Пад агульнае млявасці сцягам.*

## НАША ЭРА

*Свет больш нічога не значыць,*
*Толькі магчымасць тлумачыць*
*Гульні малекул.*

*Смерць больш не значыць нічога,*
*Толькі падсмейванне бога*
*Над чалавекам.*

* * *

*Я памятаю чарадзейны край,*
*Дзе вольны птах і дзікі кот нарвежскі*
*Дапамагалі мне адшукваць сцежкі*
*З людской гамзрні ў непазбыўны рай.*

*Любіла ў лесе я шпацыраваць,*
*Каб зліцца ў адно цэлае з прыродай,*
*Бо толькі ў ёй — сапраўдная свабода,*
*І толькі ў ёй душой магу лунаць.*

*Праз хмызнякі і састарэлы мох,*
*Далей у цемру, у гушчар, у неруш;*
*Там месцічца адзіны, каму верыш, —*
*Сусветны дэміург, паганскі бог.*

*Ён патлумачыў мне, адкуль мой род:*
*З-пад брам хваін, ад шамацення зёлак,*
*З азёрных нетраў, ад бліскучых зорак,*
*З абшару, дзе ўладарыў Рагвалод.*

*Тады, на момант затрымаўшы ўздых,*
*Я знітавала ў сваім сэрцы безліч:*
*Красу і моц зямлі, прасторы веліч,*
*І таямніцы валуноў сівых.*

*Цяпер мне млосна, розум у журбе.*
*І вабяць зноў далёкія мясціны.*
*Што ж сталася? Чаму ў сваёй Айчыне*
*Чужой я мушу адчуваць сябе?..*

* * *

*Сядзіць ля дарогі бяздомны сабака…*
*Старым стаў — і выгнаў яго гаспадар.*
*Худы і аблезлы, дварняк-небарака,*
*З надзеяй глядзіць ён прахожым у твар.*

*А людзі… Што людзі? Таксама жывёлы.*
*Навошта ім розум? Дарэмная рэч.*
*Яны не багі і зусім не анёлы:*
*Зірнуць на сабаку і тэпаюць прэч.*

*Ніхто не палашчыць, ніхто не накорміць,*
*Ніхто не падорыць прытулак і схоў,*
*Ніхто не ўратуе; усе толькі гоняць,*
*Шалеюць і шчэрацца горш за ваўкоў.*

*Былы гаспадар смажыць шкварку са смакам*
*І дбае аб выніках «Суперлато»,*
*А дзесьці ля тыну няшчасны сабака*
*Канае ад здрады і вые: «ЗА ШТО?..»*

---

# ЛІСТЫ МАЁЙ МУЗЕ

Усевалад СЦЕБУРАКА

***Юліі Васюк***

*Мне — ужо не тваіх дваццаць пяць,*
*не любы акіян па калена.*
*І званы не так гучна звіняць,*
*хоць яшчэ не па мне напэўна.*

*Мне цяпер ўсё часцей шкада*
*таго рознага, што не збылося.*
*Ды няспынна бяжыць вада –*
*і сплыло болей, чым засталося.*

*Мне не страшна было губляць,*
*дый не меў я нічога, зрэшты.*
*Як нядаўна было дваццаць пяць,*
*як няўлоўна змянілася нешта...*

* * *

*Цяжка пісаць пра вочы —*
*не бачу тваіх вачэй.*
*Не адчуваю далоняў,*
*не абдымаю плячэй.*
*Грэшна пісаць пра цела,*
*смешна пісаць пра душу.*
*Ведаю, ты б хацела…*
*Ведаю і прашу:*
*я напішу пра вочы,*
*рукі і валасы,*
*у іх запляту бы стужкі*
*нашыя галасы...*
*Я ўздыхну з палёгкай,*
*вернецца мой спакой.*
*Толькі не будзь далёка*
*толькі пабудзь са мной…*

* * *

***Ю. В.***

*Давай падлічым pro et contra,*
*святло і цень.*
*Скрозь гук фінальнага акорда*
*сцячэм слязой па джалу корда*
*у ноч, у дзень…*

*Давай зусім без дэкарацый?*
*Спектакль — удвох.*
*Без воплескаў і без авацый,*
*без бліскавіцаў папарацы.*
*Хай чуе Бог…*

*Давай пасля забудзем словы,*
*вось так — знарок!*
*Ўвесь свет маўчыць, і адмыслова*
*жыццё сваё пачнём нанова –*
*і зробім крок!*

* * *

*Штосьці няўлоўнае,*
*штосьці няроўнае,*
*нібы інэртны газ,*

*штосьці няпэўнае*
*штось патаемнае*
*ў рытміцы гэтых фраз.*

*Штосьці балючае,*
*штосьці калючае*
*стрэмкаю ў галаве.*

*Штосьці няяснае,*
*штосьці наўмыснае*
*дымам сівым плыве.*



*Штосьці такое,*
*што непакоіць,*
*што прыпыняе час...*

*Слухай, каханая,*
*шчырую споведзь:*
*нам не хапае НАС!*

## Уся праўда пра яе

***Ю. В.***

*Яна ведае мовы і моду,*
*мае цвёрды жыццёвы план,*
*і з усмешкай ўкладае прыгоды*
*ў наш сур'ёзны лірычны раман.*

*Яна любіць тэкілу «Альмеку»*
*і кудлаціць мае валасы.*
*Мы ляцім наўздагон яе смеху*
*з разваротам праз дзве паласы.*

*Яна можа ні чым не займацца —*
*проста плакаць, ці проста спяваць,*
*а ўвечары так затрымацца,*
*што я двойчы стамлюся чакаць...*

*Ды калі, нібы на фотаздымках,*
*загарнуўшыся ў мяккі плед,*
*яна сцішыцца... У абдымках*
*мне падасца — трымаю свет!*

* * *

*Усе нашыя недарэчнасці,*
*усе нашыя «супраць» і «за» –*
*такая дробязь для вечнасці,*
*як для акіяну сляза.*

*Бясспрэчна — жыццё складанае,*
*бясспрэчна — ва ўсіх свой крыж,*
*але не крыўдуй, каханая.*
*Так цяжка, як ты маўчыш!*

*Даруй! І ў звычайным вечары,*
*стамлёная доўгім днём,*
*адчуеш — казыча плечы*
*анёлак тваe*
*крылом...*

## Перад ад'ездам

*Тэкіла і пах парфумы,*
*соль на вуснах тваіх.*
*Думак маіх тайфуны*
*і Lucky Strike на двaіх.*

*Бяссонная жарсць у абдымках.*
*Наш цёплы і колкі плед.*
*І памяці фотаздымкі.*
*І твой ад'езд у абед.*

*Наш вечар, ў якім мы разам.*
*Наш вецер, які — у твар.*
*Уверх ад гатэлю «Плаза»*
*у наш караоке-бар.*

*Як мала апошняй ночы!*
*Як шмат аднаго ў адным!*
*Па-здрадніцку рэжа вочы*
*слязой тытунёвы дым…*

АБРАЗКІ

# НЕЎПАРАДКАВАНЫЯ

Ніл ГІЛЕВІЧ

## Я?.. Я — ніхто!..

Ці можа хоць на імгненне ўсміхнуцца Богу паэт? Можа, вядома. Мне, напрыклад, нядаўна пашчасціла такое імгненне перажыць. Але — толькі імгненне.

Еду электрычкай за горад. На душы — хмарна. Усе нядобрыя прадчуванні і чаканні спраўджваюцца. З бязлітаснай неадступнасцю. Хвароба прагрэсуе. Дакладней — хваробы, бо іх шмат. Але — не гэта галоўнае. Галоўнае — што прагрэсуе крызіс. Не фінансавы (хоць і ён дае знаць пра сябе). Крызіс грамадскай маралі. Крызіс культуры, літаратуры і мастацтва. Крызіс духоўнасці. Крызіс разумнай арганізацыі быцця. Хмарна — і сумна.

На першым жа перагоне ад Менску на свабоднае месца насупраць перасела з суседняга купэ немаладая жанчына — перадпенсійнага, а можа, ужо і пенсійнага ўзросту, інтэлігентнага твару, зграбна апранутая, з дзвюма — скуранай і палатнянай — сумкамі. Загаворваць з незнаёмымі пасажырамі — зусім не ў маіх правілах. Зусім. Ніколі гэтага не раблю. Сяджу і думаю сам сабе. А часцей за ўсё чытаю прэсу. Хто яна? Падумалася: відаць, настаўніца. Сельская інтэлігентка.

Як зазвычай, вымаю і разгортваю газеціну. На гэты раз — расейскую літаратурную. Зноў натыкаюся на абрыдлы, прагорклы матыў: Расія, Украіна і Беларусь — адно і тое ж, адно цэлае, і мова навукі, адукацыі, культуры павінна быць адна. «Песни петь можно и на украинском. Но создать собственную интеллектуальную культуру — сложно». Усё зразумела. Песні свае можаце спяваць. Але — не больш. Ну яшчэ і ў футбол «каждому народу можно играть своей сборной». І ўсё. Песні і футбол. Гэта палякі (чэхі, балгары, фіны, угорцы) могуць мець сваю інтэлектуальную культуру. А беларусы — ну не! Для іх досыць, каб пелі свае песні і гулялі сваёй нацыянальнай камандай у футбол. І то — часова, пакуль не гэта самае… Апусціў газету на калені, склаў на ёй рукі і не варушуся. Божа ты мой! Гэта ж усё сталае жыццё я мушу думаць адно і тое! Во каб цябе перуны спяклі, такую долю! Няма ратуначку.

Яшчэ як чытаў, колькі разоў, адрываючыся ад тэксту, падымаў вочы і лавіў на сабе позірк жанчыны, які яна імгненна адводзіла ўбок, у акно. Так і цяпер, калі я, пагараваўшы ў думках, падняў галаву. Уставілася ў акно і колькі хвілін сядзела нерухома. Калі аб'явілі чарговы прыпынак, раптам паднялася і дала зразумець, што яна выходзіць. Маўляў, ногі з праходу трохі падбярыце пад сябе, калі ласка. Раней чым пакінуць купэ, глянула мне ў твар добрымі сумнымі вачыма і замест «шчасліва» мяккім ціхім голасам сказала:

— Дзякую…



Здзіўлены такім развітаннем, я, натуральна, спытаў:

— Мне? За што? Што ціха сядзеў, не буяніў?

Па вачах убачыў, што жарт зразумела.

— За ўсё. Я ведаю, хто вы. Я пазнала вас. Па здымках у газетах…

— У такім разе скажыце, а хто — вы? — шчасліва ўсміхнуўшыся Богу, спытаў я дзіўнаватую пасажырку.

— Я?.. Я — ніхто! Была ніхто, а цяпер і зусім ніхто…

Я памкнуўся запярэчыць жанчыне: маўляў, так не бывае, кожны чалавек мае сваё імя і сваю годнасць… Але не паспеў.

— Прабачце, ужо спынілася электрычка…

Кіўнула мне галавой і заспяшалася да дзвярэй.

Вось я і ўсміхнуўся Богу. І сапраўды толькі на адно імгненне. І не даўжэй. Што ж я буду Табе даўжэй усміхацца, Божа, калі на маёй зямлі, на нашай святой зямлі добры чалавек кажа: «Я — ніхто! Я зусім ніхто!..»

2009

## Чаму яны гэта рабілі?

Некалькі вечароў запар гартаўперагортваў, чытаў-перачытваў том беларускай паэзіі, прозы і эсэістыкі пад назвай «Расстраляная літаратура». У падзагалоўку — удакладненне: «Творы беларускіх пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады».

Том — аб'ёмісты, на семсот старонак. У ім — узоры творчасці 67-і аўтараў.

Кніга страшная. Вельмі страшная. Такой кнігі няма ні ў адной краіне свету, ні ў аднаго народа. Няма — таму што няма ў свеце другой літаратуры, якая б перажыла такую жахлівую трагедыю, як наша, беларуская. Тут нам суджана трымаць «ганаровае» першынства. На працягу ўсяго некалькіх гадоў было рэпрэсавана каля сотні пісьменнікаў, з іх 67 былі гвалтоўна пазбаўлены жыцця, — або расстраляны, або замучаны на катарзе. У ліку загубленых — творцы вельмі вядомыя, якія склалі цвет нацыянальнай літаратуры, яе славу і гонар (Гарэцкі, Галубок, Ластоўскі, Лёсік, Аляхновіч, Гартны, Чарот, Зарэцкі, Жылка, Мрый, Бабарэка, Хадыка, Дудар, Галавач, Кляшторны), і зусім маладыя — аўтары адной-другой кніжкі, як геніяльны празаік Лукаш Калюга, арыштаваны на 24-м годзе жыцця, расстраляны на 28-м, як аўтар яшчэ толькі рукапісу першай кнігі, пазначаны прыкметамі геніяльнасці паэт Сяргей Астрэйка, арыштаваны ў 21 год, расстраляны ў 25 гадоў ад роду, як паэт Мікола Гваздоў, арыштаваны ў няпоўных 20 і праз год расстраляны. Былі загублены выдатныя эсэісты і публіцысты (Уласаў, Самойла, Шантыр, Цвікевіч, Рак-Міхайлоўскі, Антон Луцкевіч, Тарашкевіч, Адам Станкевіч, Смоліч, Езавітаў і інш.), чые бліскучыя артыкулы, прамовы, нататкі і сёння трэба чытаць і перачытваць, чытаць і перачытваць! — бо, здаецца, сёння яны яшчэ больш актуальныя, больш надзённыя, чым тады, калі былі напісаны.

Чытаць і перачытваць… Але каб чытаць і перачытваць, трэба — каб кніга прыйшла да кожнага інтэлігента, у кожную сям'ю, дзе ёсць маладыя людзі — студэнты, навучэнцы ліцэяў і каледжаў, гімназісты, школьнікі… А як яна прыйдзе, калі наклад — усяго семсот асобнікаў? Падумаць толькі: кніга, якая павінна быць у малады́х людзей настольнай, выйшла накладам у семсот асобнікаў! Якая ганьба! Не 70 тысяч, а ў сто разоў менш! Каму ганьба? Дзяржаве, зразумела. Нашай роднай дзяржаве. Менавіта яна магла б заказаць выдавецтву наклад у 70 тысяч асобнікаў і выдзеліць на іх выданне грошы. Магла б — калі б думала пра трагічны лёс нацыі і яе культуры, пра будучыню беларускага народа; калі б разумела, што народ будзе нацыянальнай супольнасцю толькі да таго часу, пакуль у яго ёсць свая нацыянальная культура, свая літаратура і мастацтва. А перад усім — свая мова.

Самы важны, самы галоўны акцэнт у адказе на пытанне «Чаму яны гэта рабілі?» (чаму так пазверску вынішчалі беларускую інтэлігенцыю?) так і не пастаўлены. Гаворым пра тыранію і тыранаў, пра іх нянавісць да дэмакратыі і дэмакратычных інстытутаў, да свабоды слова і сумлення і пра многае іншае. І зусім мала гаворым, што ў каланізатараў па-над усімі нянавісцямі была нянавісць да беларускай мовы, да самога духу беларушчыны. Задачай задач было — вытравіць, выгнаць беларускае слова адусюль так, каб і знаку не засталося. Бо разумелі: страшней за ўсё — калі ў беларускага народа будзе свая мова. Тады будзе і ён сам. Тады будзе ў яго і свабода і незалежнасць. Пакуль будзе жыць мова — будзе зноў і зноў абуджацца і нарастаць дух беларушчыны, будзе сцвярджаць сябе ідэя беларускага нацыянальнага адраджэння. Таму трэба фізічна вынішчыць галоўных носьбітаў гэтай ідэі — творцаў і майстроў беларускага слова: пісьменнікаў. Што яны звышшпаспяхова і рабілі.

2009

## Вобразатворныя магчымасці нашай мовы

Тое, што гэтыя магчымасці незвычайна вялікія, ведае кожны, хто добра валодае ёю — нашай роднай мовай, хто чытае творы лепшых беларускіх пісьменнікаў, майстроў мастацкага слова, чытае беларускі фальклор — ва ўсіх яго жанрах, хто любіць гартаць слоўнікі беларускай мовы, асабліва — дыялектныя і этымалагічныя. Для мяне асабіста чытаць і тое, і другое, і трэцяе — невыказная насалода. Іншы раз ну проста няма мяжы здзіўленню, як народ-моватворца крэатыўнасвабодна абыходзіцца са словам, як дасціпна і мудра карыстаецца ім, які дасканалы эстэтычны густ і майстэрства выяўляе пры гэтым! Спашлюся толькі на адзін прыклад.

Нядаўна спатрэбілася пагартаць 10-ы том Этымалагічнага слоўніка нашай мовы (навуковы рэдактар — знакаміты лінгвіст Г.А.Цыхун). і наткнуўся на любімае слоўца светлай памяці прафесара Ф.М.Янкоўскага «пустадомак». Праз Фёдара Міхайлавіча, з якім мы былі ў сяброўскіх адносінах, яно стала і маім любімым, і ў вуснай мове і на пісьме. Засведчу:

*І гаркнуў рыжы: — Пустадомкі!*
*Спыніце гэту балбатню!*
*Бо як вазьму цурбэлак ёмкі —*
*Як пацукоў вас разганю!*

*Пакуль пустою гаварыльняй*
*Вас тлумяць лекары навук —*
*Няздары з п'янай камарыльляй*
*Свае тамы здаюць у друк!..*

Гэта — як дасведчаны чытач, напэўна, пазнаў — з паэмы «Сказ пра Лысую гару», з раздзела «Вялікі рух».

Дык вось у Слоўніку і кінулася мне ў вочы «пустадомак» — з патлумачэннем: «бестурботны чалавек, які не дбае пра дом, сям'ю, гаспадарку». Гляджу вышэй і ніжэй ад «пустадомак»: аднатыпныя па ўтварэнні складаныя словы ад адной і той жа выхаднай асновы «пусты». Ды якія словы! Адно трапней, ярчэй, вобразней за другое. Пустабрэх — балбатун, пляткар. Пустабяка — (і Пустабека) — пусты чалавек, што робіць пустое і гаворыць пустое. Пустагаловак — бесталковы чалавек. Пустаглум — хто бескарысна марнуе грошы ці іншыя каштоўныя рэчы. Пустаграк — чалавек ні да чога не здатны: самахвал, хвалько. Пустагром — балбатун. Пустадумак — чалавек, што робіць неабдумана, легкадумны. Пустадзёліна — пусты, недалёкі чалавек, пустамалот. Пустазвон — балбатун, несур'ёзны чалавек. Пустальга — легкадумны, пустагаловы чалавек. Пустамалот — балбатун, чалавек, які без сэнсу гаворыць, крычыць. Пустамеля — несур'ёзны чалавек. Пустамлін — балбатун… Пустасмех — несур'ёзны чалавек, што часта і без прычыны смяецца. Пустаход — чалавек, які ходзіць бязмэтна, валацуга. І нарэшце нескладаны, а просты назоўнік Пустыня — непагаспадарлівы чалавек, пустадомак; лгун, балбатун. (У нашым выпадку казалі Пустыня — з націскам на апошнім складзе: «Што з гэтай пустынёй гаварыць?»).

Міжволі падумалася: чаму ў нашай мове так многа падобных характарыстычных сінонімаў? Ну гэта ж не так сабе, не выпадкова. Мабыць, у самой нашай грамадзе, у самой беларускай супольнасці вельмі шмат носьбітаў гэтай непрыгожай адмоўнай якасці. Мабыць, вельмі часта добраму, сумленнаму, сур'ёзнаму чалавеку даводзіцца ўсклікнуць: «Во дзе пустабрэх, га!» Або: «Ну і пустазвон! Божа, які пустазвон!» Або: «І адкуль такі пустамалот узяўся?»

2008

## Спадзяюся, грамадзяне Беларусі помняць

Вельмі непрыемны занятак — зграбаць нахляпаную на цябе паклёпніцкую гразь, але ж мусіш, бо і будзеш хадзіць абхляпаны, ніхто ж іншы не зграбе. У нас гэта амаль нерэальна, каб нехта ўзяў ды сказаў: «Як вам не сорамна — брудзіць імя невінаватага?» Хутчэй парадуюцца: «Правільна! Так яму і трэба!!»

За доўгае жыццё ў літаратуры (больш за паўстагоддзя) давялося зведаць усякае, у тым ліку і жорсткія ўдары пад дых, і нечаканыя здрадніцкія выпады, і несправядлівыя абвінавачванні ў грахах, мною не ўчыненых. Канешне, усе такога кшталту «прывітанні» ад сяброў і ворагаў я ўспрымаў з засмучэннем, а то і з болем. Хаця… бывала, што і зведваў радасць. Напрыклад, калі бачыў, што пускаюць ад злосці ядавітую сліну цёмныя прыблуды і хрыстапрадаўцы — за маю любоў да Беларусі і беларушчыны, за маю абарону роднага слова. «Ага, — казаў я сабе ў такім разе. — значыць, працую, як трэба».

Мушу прызнацца, што чым бліжэй да «краю», тым больш атрымліваю незаслужаных удараў. Нядаўна прачытаў мемуары аднаго былога партработніка і журналіста, у якіх зроблены непрыстойны замах на мой чалавечы і пісьменніцкі гонар. Іх аўтар «ничтоже сумняшеся» сцвярджае, што Камісія па адукацыі і культуры ВС РБ, старшынёй якое я быў з чэрвеня 1991 па снежань 1995 года, «зарэзала» яго кандыдатуру на званне заслужанага работніка культуры БССР, зацверджаную, як ён піша, у ЦК КПБ. Насуперак рашэнню ЦК — у Камісіі ВС БССР(пакуль быў ЦК — была БССР, а не РБ) узялі дый «зарэзалі». Гэта, мякка кажучы, дэзынфармацыя, а калі не так далікатна казаць — гэта хлусня. Ягоная справа аб прысваенні звання ў нашай Камісіі не разглядалася, бо і не магла разглядацца і, значыць, не магла быць адхіленай. Кожная Пастаянная Камісія ВС рыхтавала да разгляду на Прэзідыуме ВС справы аб званнях ці ўзнагародах строга адпаведна профілю. Напрыклад, Камісія па ахове здароўя разглядала кандыдатуры медыкаў, Камісія па навуцы — кандыдатуры вучоных, Камісія па адукацыі і культуры — кандыдатуры педагогаў, дзеячаў літаратуры і мастацтва,

# НАТАТКІ

работнікаў культасветустаноў. Што датычыць работнікаў друку, а таксама тэлерадыё, іх кандыдатуры, натуральна, разглядала Пастаянная Камісія ВС па СМІ. Такі існаваў у ВС РБ парадак разгляду «заявак» на званні і ўзнагароды. «Пакрыўджаны» ішоў на званне як партыйны журналіст, рэдактар органа ЦК КПБ, яго кандыдатура павінна была разглядацца на Камісіі па СМІ. Так і толькі так!

Праз нашу Камісію прайшлі, пры маёй падтрымцы, і атрымалі званне Народнага Р.Барадулін, І.Чыгрынаў, М.Фінберг, А.Ярмоленка, артысты М.Пятроў, С.Акружная, Г.Арлова, В.Лебедзеў, В.Белахвосцік і яшчэ з паўдзесятка артыстаў, а на званне Заслужанага прайшло, бадай, і з паўсотні прэтэндэнтаў, і ніводная кандыдатура не была «зарэзана». Так што аўтар мемуараў прыпісаў мне віну нейчую. Дзе застрэла яго справа — мог бы пацікавіцца ў архівах ВС РБ, СМ РБ, ЦК КПБ, а не выдаваць сваю выдумку за праўду.

Але мяне больш уразіла не гэта прыпісаная мне віна, а тое, як былы адказны функцыянер ЦК яе патлумачыў: «На кім жа яшчэ ўрэшце рэшт, як не на сябрах, можна прадэманстраваць сваю прынцыповасць і дзяржаўную мудрасць». Во як! Проста напавал! Гэта — я на пасадзе старшыні Камісіі ВС такім чынам прадэманстравала сваю прынцыповасць і дзяржаўную мудрасць — «рэзаннем» сяброў. Ну, што ж, мэты аўтар гэтага пасажа (падазраю: у суаўтарстве з дарадчыкам) дасягнуў. Прачытаўшы, я доўга сядзеў як анямелы і маўчаў. Божа Прамілы, Прасветлы! Шмат усялякіх подлых выпадаў зазнаў я за жыццё, гэта — адзін з самых злосных.

Спадзяюся, грамадзяне Беларусі (не самыя маладыя) помняць і ведаюць, чым быў заклапочаны і што рабіў Н.Г. на пасадзе старшыні Камісіі ВС па адукацыі і культуры, у імя чаго рваў-надрываў сэрца.

2008

## З безапеляцыйнай прастадушнасцю

Дзесь на парозе новага XXI стагоддзя мне собіла прачытаць у адным сатырычным зборніку з дазволу сказаць «паэму», у загалоўку якой значыцца імя звышсексуальнага героя парнаграфічнага твора рускага паэта да-пушкінскай эпохі І.Баркова. Вельмі непрыемна мяне ўразіла тое, што аўтар гэтай вершаванай «сатыры» выкарыстаў мой псеўданім Францішак Вядзьмак-Лысагорскі. Ужо толькі зусім сляпы і глухі чытач беларускай паэзіі сумняваўся, каму належыць гэты псеўданім. І вось — давай і я падпішу сваю «страшна смелую» сатыру папулярным літаратурным імем. І падпісаў. З безапеляцыйнай прастадушнасцю. Між іншым, ёсць адзін цікавы аспект гэтай творчай «смеласці». Аўтар ведаў, што моцна разгневаны аб'ект яго сатыры будзе помсціць... каму? Паэту, якому належыць псеўданім Ф. Вядзьмак-Лысагорскі, — паколькі той не абвяргае сваё аўтарства «Лукі». Не абвяргаў, мушу заявіць, па адной прычыне: прыпісаная Ведзьмаку-Лысагорскаму «паэма» — зусім бездапаможная ў літаратурных адносінах рэч, не можа быць, каб нехта прыняў яе за плён працы Н.Г. (Ведзьмака-Лысагорскага). Як аказалася, я памыляўся, думаючы, што ўсім і так зразумела: да прымітыўна зарыфмаванай грубай лаянкі Н.Г. не мае ніякага дачынення. Сатырычная паэзія — не лаянка, а вельмі нялёгкі від мастацкай літаратуры. Яна вызначаецца глыбінёй праніктнення ў сутнасць з'явы, сілай мастацкага абагульнення, высокай культурай пісьма і абавязкова — спецыфічнымі моўнымі фарбамі. Няма гэтых фарбаў у мове твора, няма іроніі і сарказму, дасціпнага смеху, няма ярка вымаляваных вобразаў-тыпаў, — няма і сатыры. Я быў упэўнены, што дасведчаны чытач спатыкнецца ўжо на самім загалоўку і скажа: гэта ў паэтыку Н.Г. абсалютна не ўпісваецца. Гэты брутальны «скабрезный» варварызм (Мудищев) занесены ў Беларусь з Расіі, і карыстаюцца ім тыя, хто кепска адчувае дух нашае мовы, у якой — і лаянка свая, беларуская, і свае мянушкі, ці абзыванні.

Так я думаў і, паўтараю, памыляўся. Каля году назад адзін паважаны мною літаратар даверліва спытаў: «А што ж вы не ўключылі ў свой том «літаратурных містыфікацый» паэму пра Мудзішчава?» Я, прызнацца, быў не толькі збянтэжаны, але агаломшаны. «ЯК? Вы мне прыпісваеце гэту непрафесіянальна скляпаную рэч? Хіба я працую ў паэзіі на такім узроўні?» А зусім нядаўна гэтае ж пытанне дакладна паўтарыў яшчэ адзін паважаны мною прафесіянальны чытач літаратуры. Прызнаюся, я нават трохі раззлаваўся. Дарагія сябры! Чаму так лёгка ўзаконьваеце сваім аўтарытэтам відочную фальшыўку? Хіба ў ёй бачны адметныя рысы паэтыкі маіх сатырычных і гратэскавых твораў? Прабачце, але я працую ў літаратуры прафесіянальна і ўсякае самадзейнае бэрсанне «сцішкоў» успрымаю адэкватна — як прафесіянал. Навошта ж чыёсьці бездапаможнае аматарскае вершаробства прыпісваць мне? У пачатку 70-х, калі, пад свежым уражаннем, касякамі пайшлі перайманні «Сказа пра Лысую гару», гэта можна было зразумець. Але сёння — амаль праз сорак гадоў? Пабойцеся Бога!

Каб толькі шаноўныя чытачы ведалі, як гэта ўсё мне збрыдзела і выматала духі!..

2008

## Мой час наперадзе...

Гады не ідуць, і нават не бягуць, а ляцяць-мільгаць. Здаецца, зусім нядаўна добрыя людзі віншавалі маю міласць з 70-годдзем. І быў не абы-дзе, а ў Чырвоным Касцёле юбілейны паэтычны вечар, наладжаны Таварыствам беларускай мовы. Меркавалася, што ён адбудзецца ў невялікай Дольнай зале, але народу прыйшло столькі, што яшчэ за паўгадзіны да пачатку яна была перапоўнена. А людзі, мае дарагія чытачы, усё ідуць і ідуць. Сітуацыю зразумеў пробашч касцёла кс.Уладзіслаў Завальнюк і прапанаваў перавесці публіку наверх, у вялікую, галоўную залу храма. Гэта і выратавала вечар ад непрадбачаных непрыемнасцяў. Там памесціліся ўсе. Праўда, больш паловы прысутных былі вымушаны ўвесь вечар стаяць (блізу 2000 чалавек было).

Дык вось, гады не ідуць і не бягуць, а ляцяць: толькі што было 70-годдзе, а ўжо і семдзесят пяць на парозе, бо на календары — 2006-ы. Па добрай даўняй традыцыі дзяржаўнае выдавецтва «Мастацкая літаратуры» наважыла выдаць да гэтай падзеі томік маёй лірыкі. Прытым, у гэтак званай «залатой серыі» «Беларуская паэзія XX стагоддзя». Рэдакцыяй Выбраных твораў у выдавецтве тады загадвала Наталля Семашкевіч, дачка І.А.Брыля, яна і паведаміла мне, што мая кніга ўключана ў план выдання на 2006 год, і таму, «калі ласка, дайце рукапіс». І прыслала мне брашуру «Тэматычны план выдавецтва «Мастацкая літаратура». 2006». Каб я пераканаўся, што кніга сапраўды ў плане. І я пераканаўся. Акрыліўшыся, пачаў складаць сваё невялікае Выбранае. Натуральна, адбіраў самае лепшае і, з увагі на ідэалагічную сітуацыю ў краіне, самае «бяскрыўднае». Не паспеў адвезці рукапіс у выдавецтва, як адтуль званок:

— Ніл Сымонавіч, прабачце, але радасць была заўчаснай: ваш зборнік з плана выкінулі. Зарэзалі. У міністэрстве.

— Во як! — усклікнуў я ад нечаканай навіны. — а на якім узроўні? Сам міністр? Ці намеснік? Ці хто? Можа, вахцёр?

— Мы не ведаем. З міністэрства план вярнулі моцна парэзаны. Выкінулі ўсё, што на іх думку не заслугоўвае выдання. Многіх выкінулі.

— А па гэтай серыі — «Паэзія XX стагоддзя»?

— І па гэтай таксама...

— Ну хоць хто-небудзь застаўся?

— Вядома, застаўся...

— Ну то дзякаваць Богу, што хоць нехта застаўся. Што не ўсіх падчыстую «эвэкнулі». Значыць, сяго-таго з сучасных вершатворцаў начальства цэніць. Лічу, што гэта не самы горшы варыянт, таму — не перажывайце, калі ласка.

— Вы не перажывайце...

— І я не буду. «Мой час наперадзе. Яшчэ ён прыйдзе — мой запаветны беларускі час», — працытаваў я, на развітанне, радкі з верша, якім хацеў закончыць запланаваны выдавецтвам зборнік.

2006

## Пра беларускае гучанне беларускай мовы

Адна з галоўных бед нашай сучаснай літаратурнай мовы — тое, што яна ўсё больш траціць свой уласны беларускі сінтаксіс і сваю непаўторную фанетыку і праз гэта перастае гучаць як беларуская. Мы ўсе ведаем і кажам: мова — душа народа, і гэта праўда: так, душа. Але ці многія ведаюць, што ў сваю чаргу сінтаксіс — душа мовы? У нас прывыклі перш за ўсё глядзець на лексіку — ці беларуская лексіка? Ці не зашмат у тэксце гэтак званых «барбарызмаў», слоў запазычаных, дакладней — сілком перанесеных з рускай, польскай, украінскай і іншых моў, бо, маўляў, гэта робіць беларускую мову небеларускай. Не, не гэта галоўная бяда. У кожнай мове безліч слоў запазычаных. Бяда ў іншым. Яшчэ Язэп Лёсік — выдатны знаўца роднай мовы — пісаў: «Трэба памятаць, што мова псуецца ды становіцца штучнаю, чужою і малазразумелаю не ад чужых слоў. Яна псуецца чужою граматыкаю — чужою фанетыкаю, марфалогіяю і сінтаксісам» («Узвышша», 1927, №5, стар.196). З гэтых трох «кітоў», якія вызначаюць беларускасць беларускай мовы, я вылучаю перш за ўсё сінтаксіс і фанетыку, а тады ўжо марфалогію.

Сінтаксіс, сінтаксіс і яшчэ раз сінтаксіс павінен быць беларускім! Трэба з маленства вучыць дзяцей засвойваць беларускі сінтаксіс — парадак і счапленне слоў, інтанацыю, мелодыю, музыку гучання беларускай мовы, беларускай фразы. Колькі гаворана-перагаворана: «Наша мова вельмі мілагучная, пявучая, галасістая». Так! Дык давайце ж будзем паказваць гэтыя яе цудоўныя якасці!

Другая вялікая бяда наша — небеларуская фанетыка, небеларускае вымаўленне беларускіх слоў, беларускіх гукаў, цвёрдых і мяккіх зычных, афрыкатаў дж, дз, дыфтонгаў. Гэтаму — арфаэпічным нормам — трэба вучыць дзяцей ад калыскі, з дзіцячага садка, з першых класаў школы.

У каго вучыцца сапраўднаму беларускаму сінтаксісу? У М.Гарэцкага, у Я.Коласа, Я.Купалы, у Ядвігіна Ш., у Чорнага, Мележа, Брыля, Пташнікава, Адамчыка, у Калюгі, Скрыгана, Кудраўца, Стральцова... У каго вучыцца натуральным беларускім нормам марфалогіі? У гэтых жа і іншых выдатных майстроў беларускага мастацкага слова. А ў каго вучыцца натуральнаму беларускаму вымаўленню? Перш за ўсё — у народа, у жывых носьбітаў мовы, у іх маўленчай практыцы — з агаворкай: дзе яно, маўленне, не спахаблена на рускі лад.

2009

## І найшла на душу паныласць

Вясной 1985-га, калі толькі адбыўся знакаміты сакавіцкі Пленум ЦК КПСС, што абвясціў курс на Перабудову,выйшаў з друку мой вершаваны раман «Родныя дзеці». Радасці мне гэтая падзея прынесла шмат, а яшчэ больш — хвалявання. Яно і зразумела: выдрукаваць раман у вершах — справа не жартоўная. Тым больш, калі ведаеш, што гэта першы ў беларускай літаратуры твор у названым жанры. («Новая зямля» Якуба Коласа — не раман, а звод паэм, ці вершаваных аповедаў, у гэтай геніяльнай рэчы — не раманныя сюжэт і кампазіцыя; гэта штосьць значна большае, чым раман, гэта наш нацыянальны эпас, які ў фальклоры многіх народаў у свой час аформіўся, а ў нас не паспеў). Тут — захвалюешся! Як успрымуць кнігу і што скажуць чытачы, крытыкі, а найперш — сябры-таварышы? Сяброў-таварышаў і надзяліў я навапечаным томікам. Асобнікаў трыццаць раздаў: каму паслаў поштай, каму ўручыў асабіста. І стаў чакаць водгукаў. Ці пісьмка-паштовачкі, ці тэлефоннага званочка, ці слоўца-другога пры выпадковай сустрэчы. Не чакаў толькі ад Быкава, бо ён чытаў раман яшчэ ў рукапісе і зрабіў некалькі слушных заўваг, якія я з удзячнасцю прыняў.

Чакаю тыдзень, другі, трэці, чакаю месяц, і другі, і трэці... Ніхто — ані дзлэнг! І мне стала сумна. Страшнавата стала. На душу найшла цяжкая паныласць. Як быццам я нешта надта нядобрае зразумеў. «Дык вось яно што выходзіць! — усё казаў і казаў сабе паўярнзся (г.зн. раз за разам, толькі павярнуўся — і зноў; так гаварылі, з маленства помню, мой дзед, мама і ўслед за імі — усе ў нашай сям'і). — Дык гэта ж выходзіць, што ніхто з іх маё «тварэнне» не прачытаў. Бо не магу ж я паверыць, каб сябра-таварыш, прачытаўшы, ніяк не азваўся — ні словам, ні паўсловам, — хай сабе і не хвалебным, а крытычным, нават вельмі крытычным, — у жыцці літаратара гэта натуральна. Але — каб поўнае праігнараванне? Свайго роду «змова маўчання»? Значыць, цалкавітая няўдача? Творчая катастрофа? Няўжо?

Перачытаў кнігу колькі разоў сам — уважліва, засяроджана, удумліва. Можа, сапраўды, у ёй шмат пустога, несур'ёзнага, нежыццёвага, зусім неактуальнага? Ды не: усё і сур'ёзна, і актуальна, і ўсё ад жыцця: і сюжэтныя калізіі, і характары-тыпы герояў... Дык, можа, рэч зусім слабая ў мастацкіх адносінах, можа, напісана разлезлым ці анемічна-дохлым вершам? Не, і з гэтым пагадзіцца не магу. Ніяк не магу!

О, як гэта тады мяне моцна падсекла!

На шчасце, пачалі заспакойваць і вызваляць душу ад якогасьці горкага прыгнечання чытачы. Тыя, якіх радавымі ці шэраговымі называюць. Пайшлі водгукі — у лістах, вядома. А нават і водгук у прэсе паявіўся. У «Звяздзе». Нататка журналісткі Алены Ціхановіч пра тое, як яна ў электрычцы зацікаўлена гартала прыхоплены ў дарогу раман «Родныя дзеці». Не рэцэнзія, вядома, а ўсё ж водгук. І вельмі станоўчы. Праз колькі месяцаў паэтка Раіса Баравікова надрукавала ў «ЛіМе» свае эсэістычныя нататкі паводле трох прыказак, вычытаных ёю ў «Родных дзецях». Я палічыў гэта за арыгінальную па форме рэцэнзію. Вось і ўсё, і ўсе водгукі, усе крытычныя ацэнкі.

Прайшоў год, два, тры, чатыры — ніхто з сяброў-таварышаў так і не адазваўся. Ні пісьмова, ні вусна. Праз пяць гадоў прыслаў ліст Пімен Панчанка, са шкадаваннем, што не змог раней прачытаць раман «Родныя дзеці», і вось нарэшце прачытаў. Ліст такі, што варта было чакаць не толькі пяць гадоў, але і пяць разоў па пяць. Як у падобных выпадках любіць пісаць журналісты: узнагарода знайшла героя. На гэтай аптымістычнай ноце я і стаўлю кропку.

ЭПІСТАЛЯРЫЙ

# Ларыса Геніюш: «МЯНЕ НЕЛЬГА НАВАТ УСПАМІНАЦЬ»

Публікацыя гэтых лістоў Ларысы Геніюш стала магчымай дзякуючы клопату рупліўца на ніве беларуска-ўкраінскага літаратурнага пабрацімства Рамана Лубкіўскага, пісьменніка, Надзвычайнага і паўнамоцнага пасла Украіны. «Гэтыя унікальныя дакументы, — адзначыў у сваім лісце Раман Лубкіўскі, передаючы невядомую раней эпісталярыю Л. Геніюш у мінскі Музей гісторыі беларускай літаратуры, — атрымалыя мною з асабістага архіву выдатнага паэта І. Гнацюка, лаўрэата Нацыянальнай прэміі Украіны імя Тараса Шаўчэнкі, сведчаць не толькі пра цікавыя асабістыя творчыя ўзаемаадносіны, але і пра глыбокае разуменне долі нашых народаў і значнасць іхняй супольнай працы дзеля ўзаемаўзбагачэння дзвюх спараднёных нацыянальных культур».

Лісты Ларысы Геніюш — па-мацярынску пяшчотныя. За кроплю дабрыні і ўвагі яна, каму лёс даў мала светлага, імкнулася ўзамен аддаць утрая больш. Хуткі почырк паэтэсы, да ўсяго, увекавечваў і аўтарскія споведзі, і гаротныя развагі над жыццём былой сталінскай зэчкі ў савецкай імперыі.

Цалкам згаданая перапіска была апублікаваная намі ў №10 альманаха «Тэрмапілы». У публікацыі цалкам захоўваецца аўтарскі правапіс.

С.П.



Магіла паэтэсы ў Зэльве. Скульптар Міхась Інькоў

**Зэльва, 11/VIII-70 г.**

Дарагі Сябра Іван!

Дружа мілы, дзякую Вам за памяць. Не ведаю, ці гэты ліст да Вас дойдзе. Кіне яго муж у Баранавічах. Сябры маі чыталі ў Аўстраліі «Жовтень». Яны захопляныя. Гэта было для мяне адзінае прывітанне ў прэсе [Ва ўкраінскім часопісе «Жовтэнь» (№3, 1970 г.) была апублікаваная нізка вершаў апальнай на той час Ларысы Геніюш. Сярод перакладчыкаў вершаў быў і Іван Гнацюк, якому ў горад Барыслаў Львоўскай вобласці адрасуюцца лісты. — Рэд.]. Дзякую Вам усім! Людзі былі аж з Караганды. Было многа плачу. Адна дзяўчына шукала нас, каб павіншаваць і перадаць падарак аж з Лос-Анжаласа. Ад свае сястры… Старая хата ўся была ў кветках. Не ўсе людзі баяліся. Йшлі з букетамі, нават прадаўшчыца з магазіна. Усім была чарка. Бог памагаў, і ўсяго хапіла і асталося.

Яшчэ трывожна, усе раз'ехаліся. Здароўе маё няважнае. Столькі гора прынесьлі мне і прыносяць маі ворагі, гэта надчалавечыя сілы.

Браты маі, сябры маі дарагія, дзякую Вам за ўсё і буду вельмі рада бачыць Вас у сваёй хаце. Прыязджайце яшчэ зацепла, каб пагутарыць мы змаглі ў чыстым полі пад нашым небам.

Бывайце здаровыя, заставайцеся з Богам!

**Ваша Ларыса Геніюш.**

**Зэльва, 18/IX, 70 г.**

Дарагі і паважаны Дружа!

Дзякую Вам за ліста і за ўсе Вашыя шчырыя і добрыя словы.

Як жаль, што Вы хворы, як жаль. Хацела б болей ведаць аб стане вашага здароўя. Прыкра толькі, што вас не друкуюць у перыёдыцы. Ці гэта часова? Чым «правініліся»? Пішуць мне сябры здалёк, што вашыя суродзічы і там мяне не забылі! Дзякуй Ім вялікае! Успомніла мяне на днях пару словамі і беластоцкая «Ніва». Пішу цяпер мала, крыху хварэю. Усюды на мяне такая «нагонка», што жыць цяжка, не тое, што пісаць. Лісты да мяне пагана даходзяць, а ад мяне да людзей яшчэ горай. Нават да сына даходзяць не ўсе. Але, як Вы зазначылі, мы да ўсякіх труднасьцяў ужо прывыклі. Жыву як затворнікі і многа працую ўдома фізычна. Чытаю.

Калі б змаглі да нас прыехаць, дык будзем Вам вельмі радыя, пазнаёміцца нам неабходна. Маё прызнанне і ўдзячнасьць да вас не маюць граніцаў. Лёс мой не цікавы, таму чым хутчэй прыедзеце, тым лепш, бо рознае можа здарыцца. Век мой глыбокі, і жыццё маё было і ёсць цяжкім ва ўсіх разуменнях.

Друкаваць мяне болей не трэба. Я чула, што мяне нельга нават успамінаць. Слава і нізкі паклон «Жовтню» за яго адзіныя тут і шчодрыя віншаванні. Гэта было хораша!

Я ўсё думаю аб Вашым здароўі, толькі б Вам было добра!

Муж едзе ў Мінск і кіне гэтага ліста. Я чакала падобнай нагоды, таму і запазнілася з адказам. Прашу прабачэння.

Шчыра вітаю Вашую жонку. Я рада, што вы не адзін.

Я заўсёды цэлым сэрцам любіла ўсё, што было Украінай, і вось атрымала такую вялікую падзяку. І я шчаслівая.

Усяго Вам добрага, светлага, Дружа — творчасці невычарпальнай і сілаў, сілаў.

З вялікай павагай і ўдзячнасцю да вас

**Ларыса Геніюш.**

**1980–81 г. Зэльва.**

Дарагі Сябра Іван!

Шчыра вітаю Вас з усімі Сьвятамі, з наступаючым 1981 г.

Здароўя Вам выдатнага, творчых посьпехаў! Буду рада бачыць Вас у сваёй хаце сялянскай з Ф. Янкоўскім [Вядомы беларускі вучоны-лінгвіст, доктар навук, прафесар (1918–1989). Рэд.], тым больш калі толькі яму хопіць адвагі заехаць да мяне… Я мала ведамы чалавек, з якога мала карысьці на сёння. Жыву, як і раней. Нашыя простыя людзі апякуюцца мною часамі ўзварушліва.

Моцна хварэю сэрцам, але да сустрэчы з Вамі я пастанавіла дажыць. Цешуся, што ў Вас усё добра і што выходзіць кніжка.

Заўсёды са шчырай павагай да Вас

**Ларыса Геніюш.**

ВЯНОК

# З АСАБЛІВАГА РОДУ

**Генрых ДАЛІДОВІЧ**

**Бадай, для многіх і цяпер яна, зямная жанчына з незвычайнага роду, паэтка, па-ранейшаму застаецца загадкай.**

Чаму, выхаваная ў расейскім асяроддзі, пачала не толькі пісаць па-беларуску, але да самай глыбіні душы праніклася нацыянальнай ідэяй і ўсё сваёе жыццё асвечвалася беларускімі нацыянальнымі сімваламі? Чаму яна дзейнічала менавіта так, як спаўняла свае жыццёвыя і творчыя ўчынкі? Чаму, урэшце, адны яе і цяпер зусім не ведаюць, а іншыя шчыра ўшаноўваюць альбо папікаюць ва ўсіх смяротных грахах? Вось і разбярыся: калі Святое Пісанне заклікае маральна не судзіць, бо і сам маральна судзімы будзеш...

Пэўныя адказы на гэтыя і іншыя пытанні ёсць. Да беларускасці яе далучыла ў многім абеларушаная на пачатак XIX стагоддзя Вільня, паводзіны ж, прыезджай у гэты горад, бурна вызначылі ўмовы існавання пры даваенных таталітарных польскай і савецкай уладах, горкае спазнанне сістэмы Гулагу і нямецка-фашысцкай акупацыі. Выстаяць у гэтых абставінах ёй, шляхетнай, з высокімі маральнымі прынцыпамі жанчыне, было вельмі няпроста.

Невядома, хто з яе крытыкаў у тых стасунках мог бы паводзіцца інačай, нават паўтарыў бы такую ж вытрымку, здолеў бы пісаць вершы без ніякіх надрыву і злосці. Яна ж была верная запавету, выказанаму яшчэ ў адным з першых вершаў у 1925 годзе: «Ўсё, што ў сэрцы жыве і пяе, — Вершы мае...». Яна — «паэта чыстай красы». Яе хвалявалі не рэвалюцыйныя ўзрушэнні і буры, не нейкія «генеральныя лініі», а гістарычная памяць народа, хараство прыроды, фарбы роднай зямлі, жаночыя і мацярынскія пачуцці. Гэта — своеасаблівы паэт. Ды, можа, не накірунку свайго славутага продка Лермантава, а такіх, якімі ў рускай паэзіі былі Цютчаў і Фет. Яна ўглыбілася ў сябе рускасць розумам, але душа яе нечакана заспявала беларускасцю…

Загадкавая Яна — гэта Наталля Арсеннева. Яна пабачыла свет 20 верасня 1903 года ў горадзе Баку. Бацька яе паходзіў са славутага роду Арсенневых (які па жаночай лініі і вызначыўся славутым прозвішчам рускага пісьменніка Міхаіла Лермантава). Зразумела, яна змалку была далучаная да выдатнай творчасці роднаснага генія, але і з юных гадоў адчула магію беларускай мовы і паэзіі. Гэтаму паспрыяла тое, што яе сям'я пераехала ў Вільню. Там гімназісткай Н.Арсеннева пазнаёмілася з многімі беларускімі творцамі. Таму не выпадкова пазней выбрала шлях служэння беларускай асвеце і культуры, дзеля чаго ў 1921 годзе скончыла курсы настаўнікаў беларускіх школ (на гэтым этапе мо і вызначальны выбар ёй паспрыялі зрабіць выкладчык, пісьменнік, вельмі абаяльны чалавек Максім Гарэцкі і навуковец-публіцыст Браніслаў Тарашкевіч). Вучылася паэтка і ў Віленскім універсітэце.

Праўда, яна не закончыла вучобу, выйшла замуж за ўраджэнца Валожыншчыны, удзельніка Першай сусветнай вайны, які намагаўся спалучыць маласпалучальнае: службу афіцэрам у польскай арміі і дзейнасць беларускага палітыка. Каханне падарыла ім першынца — сына Яраслава (загіне ў Мінску ў 1943-м разам з іншымі маладымі беларускімі гурткоўцамі ў Купалаўскім тэатры ад узарванай партызанамі міны). Знойдзецца час закончыць і ў 1927 годзе выдаць першую кнігу паэзіі «Пад сінім небам». Менавіта — не зборнік, а кнігу: яна і цяпер падаецца выбраным з раней напісанага. У выданні сабраныя творы розных жанраў за паўдзесятка гадоў (вершы, вершаваныя апавяданні, паэма). Да ўсяго творы шматтэмныя і зусім не на пачаткоўскім узроўні. І не выпадкова гэтую кнігу дэбютанткі высока ацэняць многія вядомыя знаўцы паэзіі ...

Ды жыццё для такой незвычайна-загадкавай, рускай па выхаванні, а беларускай па духу паэтэсы не будзе бясхмарнае. І не толькі тым, што сям' і вайскоўца нялёгка ад пабытавых турбот. З'явяцца іншыя, больш цяжкія выпрабаванні. Хоць муж у 1939-м удзельнічаў у вайне з фашызмам, але ўсё роўна быў інтэрнаваны савецкімі войскамі . А яна, хоць лаяльна аднеслася да савецкай улады, пачала працаваць у савецкай газеце «Вілейская праўда» і нават дапамагала напісаць «Пісьмо таварышу Сталіну ад працоўных Заходняй Беларусі», з двума сынамі была высланая ў Казахстан. На той час без ніякай віны вінаватая...

Тыя, хто высока адзначалі яе чалавечую інтэлігентнасць, глыбокі патрыятызм, арыгінальную творчасць (Янка Купала, Максім Танк і інш.), здолелі ў 1941-м вярнуць выгнанніцу на Радзіму. Акрыялая паэтэса пачала рыхтаваць новы зборнік паэзіі, ды выйсці яму перашкодзіла вайна. У час яе муж прыймаў удзел у фармаванні беларускіх вайсковых сіл пад нямецкім камандаваннем, а яна ў асноўным па-ранейшаму займалася хатнімі клопатамі, удзельнічала ў Мінску ў культурна-асветнай рабоце і пісала вершы. У кнізе «Сягоньня» (1944) асуджала вайну, яе жорсткасць і, як напісана ў энцыклапедычным даведніку «Беларусь» (Мн., 1995), «не падзяляла ўдзельнікаў вайны на «сваіх» і «чужых»; успрымала вайну як наканаванасць, якой яна бяссільная супрацьстаяць». У 1944-м выехала ў Нямеччыну, у 1950-м — у ЗША, дзе жыла да апошніх дзён. У 1979 годзе выдала паэтычны зборнік «Між берагамі».

Як і ў іншых паэтаў-эмігрантаў, у яе творчасці пасляваеннага часу таксама былі моцныя матывы ўспамінаў, настальгія па Бацькаўшчыне з усімі яе праявамі, адданасць беларускай нацыянальнай справе. Наталля Арсеннева — аўтар эміграцкага гімна (верш «Магутны Божа»). У 1992 годзе ў Мінску ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» факсімільна быў перавыдадзены яе зборнік «Пад сінім небам», дзе дадаткова былі змешчаныя яе кароткая біяграфія , прадмова (Я. Лецка) і датаваныя 1928 годам выказванні Максіма Гарэцкага. Прызнаны майстра ўжо тады залічыў аўтара першай кнігі ў лік «выдатных іменняў», вершы якой «не вызначаюцца нейкай асаблівай бліскучасцю, але яны захопліваюць шчырасцю пачуцця, далікатнага тону і нейкаю асаблівою пяшчотнасцю вобразаў і слоў...»

Здаецца, паэтка годна апраўдала і надзеі Максіма Гарэцкага, і свой дэвіз, выказаны яшчэ ў 1922 годзе ў вершы «Мэта жыцьця»:

*... Мэта жыцьця, кажуць,*
*гэта — хаваці*
*Сэрца ад смуткаў і сьлёзаў*
*ня знаці.*
*Думкі аб праўдзе...*
*Гэт, глупства усё,*
*Мэта жыцьця —*
*захаваці жыцьцё!*

РЭЦЭНЗІЯ

# ЧЫТАННЕ ЯК ПРАЦА

Анатоль ІВАШЧАНКА

**Віктар Казько. Дзікае паляванне ліхалецця: эсэ, публіцыстыка. — Мн., Кнігазбор, 2009 (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; вып. 2).**

Чатыры гады таму — нібыта й нядаўна, але, ацэньваючы адрознасць літаратурнай сітуацыі тады й цяпер (найперш — не адабраны яшчэ Дом літаратара як эпіцэнтр культурнага жыцця, дзе штомесяц ладзілася па некалькі буйных вечарынаў і з дзесятак драбнейшых; ды й кніжныя навінкі, здаецца, больш жвава абмяркоўваліся і на старонках друку, і ў, так бы мовіць, «кулуарах»), то ўжо і даўнавата, — дык вось, чатыры гады таму ў «Дзеяслове» выйшла даволі вялікая памерам аповесць Віктара Казько. Памятаю тагачасную размову пра яе з рэдактарам адной паважанай мною — і тады, і цяпер — газеты (што праўда, тады на яе старонках літаратура, ізноўткі, займала куды болей месца). Рэдактар прызнаваўся, што сам аповесці не чытаў праз брак часу, але ягоныя супрацоўнікі, адказныя за крытыку, пагарталі й не знайшлі там нічога выбітнага. У той жа час мне, працуючы ў Саюзе пісьменнікаў, даводзілася чуць звышстаноўчыя водгукі пра гэты твор ад літаратараў, якія проста так словамі наогул не кідаюцца, а ў ацэнках твораў сучаснікаў і пагатоў. Спакуслівая проста было б патлумачыць адрознасць успрымання твораў В. Казько ўзроставым крытэрам: маўляў, «старая гвардыя» адна саміх сябе й чытае, а моладзь ашчаджае свой звышкаштоўны час на штосьці больш адназначнаелабавое (накшталт скандальнага «Дзённіка крыніцы»). Але, усё ж, наважуся на рэфлексію больш уважлівую (дадаўшы, што так і не сустрэў аніводнае рэцэнзіі як на гэтую аповесць, так і на іншыя творы В. Казько, што з'яўляліся цягам апошніх гадоў).

Перадусім прызнаюся ў тым, у чым рэцэнзенту прызнавацца нібы й не да твару: новую кнігу В. Казько я прачытаў не цалкам. Некалькі эсэяў былі знаёмыя па «дзеяслоўскіх» публікацыях, некалькі прачытаў цяпер, а тоесёе і перагарнуў, пакінуўшы на пасля. Проза Казько — не тое, што прачытваецца «на раз», «запоем», лёгка пераварваецца й хутка забываецца. Яна, выпакутаваная і прапушчаная праз сябе, як праз мясарубку, для тых, хто яшчэ не развучыўся чытаць. То бок — чытаць з поўным паглыбленнем. Для каго чытанне — не забаўка, а праца (праца, у першую чаргу, над сабой)...

Барыс Акунін, калі ў яго запыталі, ці лічыць ён сябе буйным пісьменнікам, без ценю какецтва адказаў: не лічу, я — белетрыст. І патлумачыў: пісьменнік выкладае на паперу свае пачуцці, боль і радасць, белетрыст жа — толькі



атрамант. У гэтым месцы дарэчы будзе звярнуцца да эсэ Валянціна Акудовіча, якое друкавалася ў «Arche» №6 за 2007 пад назвай «Вялесаўская лекцыя».

У эсэ прасочваюцца прычыны і вынікі паўстання «масавага чалавека», які «досыць хутка перафармаваў усю структуру цывілізацыі адносна самога сябе як дамінантнай катэгорыі» і, адпаведна, — спарадзіў сваё мастацтва (што мянуецца сёння масавым ці поп- альбо мас-культурай). Яго канцэптуальнае несупадзенне з мастацтвам высокім, паводле В. Акудовіча, у адрознасці эстэтычных вымярэнняў: так, маскульт палягае ў гарызанталі (ці паверхні, што з'яўляецца «не адметай яе нягегласці, але прынцыповай пазіцыяй» і характарызуецца «татальнай баналізацыяй» ва ўсіх сферах жыццядзейнасці); мастацтва ж высокае (да якога аўтар ужывае мінулы час) «укладалася ў парадыгму вертыкалі». «Высокая літаратура... прагнула не чытача, а Ісціны. Але і чытач той пары шукаў у літаратуры не забаву, а Ісціну. З гэтага супольнага... памкнення да «зорнага неба» кожны творца аж прыпадымаўся на дыбачкі, каб выглядаць нават вышэйшым за самога сябе — тады яшчэ па азначэнні высокага. Гэтак... было здавён, — канстатуе В.Акудовіч, — але пад канец XX ст. здарылася нешта цалкам неверагоднае, чаго раней ніхто і ўявіць сабе не мог. Пісьменнік самахоць пачаў адмаўляцца ад вышыні».

В. Акудовіч апісвае агульнасусветную тэндэнцыю, не акцэнтуючыся на беларускай сітуацыі. Так, у прыклад канстатаванай метамарфозы філосаф згадвае П. Каэлья, Б. Акуніна, У. Эка, якія «выбавілі сябе ад вышыні, каб атрымаць магчымасць прыкаленіцца ўпоравень збаналізаванаму чалавеку». І хаця гаворка ў нас не зусім пра баналізацыю свету ўключна з літаратурай, але заўважым, што канстатаваныя працэсы ўсё ж пачаліся значна раней за канец XX ст. І працэсы гэтыя бачацца наколькі натуральнымі, нагэтулькі ж і незваротнымі. Вось, В. Акудовіч разводзіць па полюсах супрацьлеглых эстэтычных вымярэнняў імёны Уолта Дыснея і Дастаеўскага як геніяў, адпаведна, масавага і высокага мастацтваў. Але давайце згадаем: ці такім ужо элітарным быў Дастаеўскі для яго сучаснікаў? Ці не да дэтэктыву — тыпалагічна «нізкага» жанру — звярнуўся ён у сваім самым праграмным творы дзеля сцвярджэння вядомых кожнаму школьніку маральных імператываў? Ды й, зрэшты, ці стаў бы Дастаеўскі тым, кім ён ёсць, каб пісаў менш чытэльна? Дыялектыка, клятае пытанне мэты і сродкаў...

«Вялесаўская лекцыя» В.Акудовіча згадвалася пад час чытання «Дзікага палявання ліхалецця» не аднойчы, як і раней пры чытанні твораў В. Казько — перадусім яго эсэістыкі, — карцела вызначыцца з феноменам яго творчасці, з'ява якое і захапляе, і бянтэжыць сваёй невытлумачальнасцю... Відочна, што і самому пісьменніку (як, магчыма, і некаторым іншым прадстаўнікам гэтак званага «старэйшага пакалення»), не проста вызначыцца з гэтым пытаннем: як і для каго пісаць ва ўмовах «новай літаратурнай сітуацыі»?..

В. Казько мае на гэты конт непахісную пазіцыю. Вось яго выказванне з «Уступнага слова да трохтомніка, які па незалежных ад аўтара прычынах не ўбачыў свету: сканаў у абдымках росквіту рыначнай дэмакратыі, незалежнасці і свабоды» пад назовам «Я вам ніколі не схлусіў»: «Пісьменнік — чытач, заўсёдная, пракавечная і паўсюдная гульня. Хто з іх пан, хто служка? Каб я гэта ведаў, я б тады пагуляў. Не ведаю, дарагі мой чытач, і таму я з табою не імкнуся гуляць. А мо, наадварот, таму і гуляю. Толькі ведай адно, чытач: у той гульні я ніколі табе не хлусіў, не хлушу і хлусіць не буду, позна ўжо. Хаця, па шчырасці, ой як бы хацелася табе схлусіць, зачараваць цябе магутнай, агіднай і прыгожаю хлуснёй. Але ж... Майму веку і маёй натуры наканавана нешта зусім іншае».

«Жыць без хлусні», пісаць без хлусні — вось жыццёвы і творчы дэвіз гэтага, як ні сумна канстатаваць, адыходзячага пісьменніцкага пакалення. Наогул, да эсэ В. Казько часта дарэчным бачыцца такое жанравае вызначэнне, як мемуарыстыка: нарацыя пісьменніка, як правіла, ідзе ад апісання нейкае канкрэтнае падзеі — першага курапацкага мітынга, сумеснай паездкі з Васілём Быкавам і Алесем Адамовічам альбо цела чалавека, раструшчанага чыгункай, што некалькі дзён ляжыць на рэйках пад безуважнымі позіркамі заклапочаных ураджаем дачнікаў. Дарэчы, як гаворыць В. Казько ў цытаванай вышэй пасляслове, і проза пісьменніка вызначаецца суцэльным аўтабіяграфізмам.

Гледзячы на эсэістыку В. Казько праз прыцэл акудовічаўскага «ружжа», відавочна, што яна выяўляе пакліканне пісьменніка да ўсё тых жа кантаўскіх зорнага неба і маральнага закону ўнутры. Апеляванне да сакральнага і трансцэндэнтнага, творчая дэміюргавасць поруч з апакаліптычна-фаталістычным пасылам — вось чыннікі творчай манеры В. Казько. Праз усе тэксты кнігі праходзіць скразная лінія — выяўленне прычынаў і наступстваў працэсу «азвярэння» чалавека ў «час пярэваратня», «ліхалецця», што суадносіцца з савецкай эпохай і працягнутага чарнобыльскай катастрофай ды дзеяннямі існага рэжыму па руйнаванні мовы, культурнай спадчыны і г.д. Пры гэтым, вельмі яскрава адказваючы на сакраментальнае «хто вінаваты», аўтар не кажа, што рабіць.

Наважуся на дапушчэнне, што творчасць В. Казько — прыклад дзіўнага міксу, сутыкнення высокага-элітарнага з калі не маскультам, то з пісаннем, што ад пачатку апелюе да люду паспалітага. Гэта добра відаць і на тэматычным узроўні (глабальныя пытанні светабудовы, што ўздымаюцца, так ці йнакш завязаныя на лёсе «простага чалавека», які ёсць пунктам адліку, цэнтрам гэтае светабудовы), і на лексічным (часам нават з адмыслова стылёва «заніжанай» лексікай).

Часам «мэсыдж» пісьменніка падаецца крыху цьмяным, а пазіцыя непаслядоўнай. Так, пры ўсёй лютай варожасці аўтара да рэжыму, ад якога цягне «смуродам... апрычніны, тхлом Лубянкі і Валадаркі, духам, што так і не выветрыўся да сённяшняга дня з 37-га года», распад СССР мянуецца «белавежскай змовай», апошнія гады імперыі — пачаткам «летапісу вар'яцтва», а падыход да панятку «дэмакратыя» падобны да рыторыкі антыамерыканскіх жахалак кшталту «Дух часу» ці «Амерыканскае шоў». Але ў гэтай шурпатасці, нежаданні падладжвацца пад растыражаваныя схемы, устаноўкі ці замовы не загана, а наадварот — прыцягальнасць гэтага празаіка, якога, згодна з яго ж тэзаўрусам, так і карціць назваць адзінокім ваўком нашае літаратуры — за спартанскую нязломнасць духу і ўражвальную прынцыповасць поруч з гранічнай шчырасцю выкладу.

Углядаючыся ў буйны фотаздымак Віктара Апанасавіча з тытулу яго новай кнігі, на якім пісьменнік нібыта пасміхаецца, лаўлю сябе на супярэчлівай эмоцыі: а ці радасць там, за прымружанымі вачыма? Ці ўсё ж боль? А мо ашчэр? Глыбокія зморшчыны-барозны, як сляды, пакінутыя перажытым ліхалеццем. З такім выразам ідуць пад танкі...

Сталася амаль нормай, што рэцэнзія — гэта альбо «піяр», альбо, залежна ад акалічнасцей, «чорны піяр» (так і карціць працягнуць — у часе чумы). Магчыма, гэта не ёсць прыкметай часу сённяшняга, і сутнасць пытання вечная... Але мне найменш хацелася б, каб гэтая рэцэнзія ўспрымалася як «прапіяраванне», бо само гэтае слова — з той, маскультаўскай, тэрміналогіі. Пустазвонны «піяр» творчасці Віктара Казько быў бы найперш непавагай да таго, што ён робіць. Але, хочацца верыць, што кніга ўсё ж знойдзе свайго чытача — чалавека, які не баіцца цвяроза «зазірнуць у вочы свайму «Я».

Завершыць жа хочацца цытатай з эсэ «Паміж цюленем і акрабатам, альбо Энергія надзеі»: «Мы нарадзіліся ў клетцы. Нас выпусцілі на волю. І сёння мы ўсе, як дзікія жывёлы, узгадаваныя ў штучнай абстаноўцы і выпушчаныя ў абстаноўку натуральную, не маем паняцця пра жыццё на волі. Яна апальвае нас. Многія з нас асуджаны, як ні горка, але трэба мець мужнасць прызнаць гэта. І ўсё ж на волі ёсць заўсёды надзея. Хоць Максім Гарэцкі і гаворыць, што надзея — маці дурных. Але гэта — адзінае, што застаецца ў нас сёння. І гэта не так ужо мала. Надзея — пастаянны стан душы сёння, яна сапраўды памірае апошняй».

**Ад «Ь»:**

Паляванне ліхалецця, на жаль, застаецца не толькі высокай аўтарскай метафарай. Новую кнігу эсэ і публіцыстыкі Віктара Казько, выдадзеную ў Бібліятэцы СБП «Кнігарня пісьменніка», па распараджэнні чыноўнікаў (ці, правільней, з дапамогай ананімных даносчыкаў) забаранілі распаўсюджваць праз дзяржаўныя кнігарні. Хоць «надзея і маці дурных», хоць яна і памірае апошняй, але ці не па-дурному такое ўспрымаецца: шчырая і балючая кніга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі з серыі «Кнігарня пісьменніка» схаваная «пад прылавак» у дзяржаўнай мінскай краме «Кнігарня пісьменніка»?!

Тым не менш, аб набыцці гэтай ды іншых кніг серыі «Кнігарня пісьменніка» можна даведацца па тэл.: (Velcom) 637-66-43; (МТС) 274-85-97.

НАГОДА

# Антаніна ХАТЭНКА: «ВІЗБІ — ЛАБАРАТОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ»

**Як ужо вядома, Саюз беларускіх пісьменнікаў быў прыняты ў агульнаеўрапейскую пісьменніцкую супольнасць — стаў паўнапраўным членам Еўрапейскай Пісьменніцкай Рады. Наладжаныя плённыя стасункі з многімі пісьменніцкімі арганізацыямі, сярод якіх — Саюз шведскіх пісьменнікаў. З дапамогай апошняга члены старэйшай творчай арганізацыі Беларусі маюць магчымасць адпачываць і працаваць у Балтыйскім цэнтры пісьменнікаў і перакладчыкаў у Візбі на шведскім востраве Готланд. Летам яго наведала паэтэса Антаніна Хатэнка, якая ветла падзялілася з «Літаратурнай Беларуссю» сваімі думкамі і ўражаннямі…**

«Балтыйскі цэнтр пісьменнікаў і перакладчыкаў у Візбі — не толькі прыгожы, утульны, ветлы і камфортны прыстанак для творцы, які спрадвек шукае адзіноты ды ўсясветнай гармоніі, але перадусім шчаслівая магчымасць пазнаць, уласнаруч памацаць іншае, адрознае ад звыклага, жыццё. Прынамсі, менавіта гэты шанец пабытавання ў іншай прасторы, у іншых духовых каардынатах падаецца істотным нам — беларусам, псіхалагічна замкнёным на балючых праблемах нацыянальных перспектыў.

Апынуўшыся ў краіне з прыярытэтамі асабовай волі й чалавечай годнасці, пачынаеш міжволі разумець карані й глыбінныя прычыны моўнай і культурнай трагедыі на Бацькаўшчыне. Пакуль знаходзішся на Готландзе, у асяродку пісьменнікаў і перакладчыкаў з розных краёў свету, спасцігаеш не адно простую ісціну цэласці, злучнасці зямнога быцця, але й спакваля выспельваеш сведамленне сябе сапраўднай, не дэкларатыўнай, часцінай Еўропы, жывой яе клеткай. І гэтае пачуццё, зусім адрознае ад таго, што зведваеш дома, зарганізоўвае адметны лад мыслення, спрыяе фармаванню новай маральна-каштоўнаснай сістэмы. Бо насамрэч тут, у Беларусі, мы ўсе, хай сабе і ў розная ступені, яшчэ застаемся інфекцыяванымі на залішнюю ідэалагізацыю, схематызацыю жыцця, на структураванне ўсіх яго праяў і форм ды пазначэнне цэдлікамі.

Гасцяванне ў пісьменніцкім Цэнтры зарганізавана так мудра, што, маючы свабоду выбару, набываеш і асаблівую, удзячлівую, адказнасць перад светам, які прымае цябе, аберагае Богам дадзены дар і ствараe ўмовы для яго рэалізацыі. Пры гэтым неўпрыкмет яшчэ й навучае гэтак жа пашанотна абыходзіцца з самім сабой і ўсім жывым на Зямлі…

Цэнтар у Візбі — выдатная лабараторыя літаратуры, майстроўня мыслення, творчага паразумення разнамоўных і рознаменталітэтных людзей. Клопатам Алены Пастэрнак і яе памагатых у гэтым ветлым доме на пэўны час аказваешся ў сутворчай планетарнай сям'і. І гэта як найлепей паслугуе раскрыццю ўнутраных інтэлектуальных і духовых рэсурсаў, што зноў-такі надзвычай важна для нас — прадстаўнікоў Саюзу пісьменнікаў, адпрэчанага дзяржавай.

У Швецыі я (мабыць, толькі на некаторы час) пазбавілася нарэшце ад пачуцця супрацьву, якое прыгнятае й спараджае непазбыўны, нібыта, комплекс барацьбіта ўдома. А гэта азначае, што наладжванне й фундаванне такіх паездак адыгрывае агромністую ролю ў працы нашай нацыянальнай інтэлігенцыі на аднаўленне прынцыпаў волі й самадастатковасці ў беларускім грамадстве. Папраўдзе ж, раўнаважнасць, у якую патрапляеш у Візбі, паўстае ці не самым галоўным урокам дэмакратыі. А таму, вярнуўшыся на радзіму, кожны з нас, мяркую, найперш памкнецца нейкім чынам перадаць суайчыннікам гэты станоўчы досвед уладавання жыцця на аснове ўзаемапавагі, даверу й захавання этнічных адметнасцяў. І, такім чынам, укладзеныя ў падобныя паездкі намаганні й сродкі аплачваюцца найвышшым духовым коштам: адна з цэнтральнаеўрапейскіх краін, Беларусь, паступова мае наблізіцца да вынаходжання свайго месца й сваёй ролі сярод народаў-суседзяў. І якраз пісьменнікі пракладаюць гэтую дарогу, скарыстоўваючы прыязнасць і клопат каралеўскай Швецыі, праз якую мы раўнапраўна далучаемся да еўрапейскіх літаратурных звязаў. За тое й выказваю я асабіста ўсім руплівцам на гэтым грунце шчырую падзяку…».

## ПАЛІЦА










**Барыс Пятровіч. Піліпікі. Мініяцюры. — Мінск, «Галіяфы», 2009. — 88 стар.**

**Эдуард Акулін. Вітражы. Вершы. — Мінск, «Галіяфы», 2009. — 110 стар.**

**Леанід Дранько-Майсюк. Анёлак і я. Апавяданне. — Мінск, «Галіяфы», 2009. — 96 стар.**

Выдавецтва «Галіяфы» папоўніла паліцы аматараў прыгожага пісьменства трыма новымі «кніжкамі-малюткамі»:

«сто гадоў таму напісанымі» карацелькамі Барыса Пятровіча — першымі спробамі прышчапіць на беларускую мову пачынанні Хармса і — шырэй — постмадэрнісцкія кветкі ў сучасную прозу;

кароткімі вершамі Эдуарда Акуліна — каляровымі шкельцамі ў вітраж нашай паэзіі;

адным з лепшых сучасных апавяданняў Леаніда Дранько-Майсюка пра гламурную N, хлопчыка, які чакае маці, пра мужчыну, якога пакінула каханне, і пра Беларусь — як пра сустрэчу новай зямлі з раскіданым гняздом…

**Міхась Скобла. Акно для матылькоў: паэзія, проза. — Мінск: «Про Хрысто», 2009. — 312 стар.**

Арфейны томік выбранага з твораў Міхася Скоблы склалі найбольш метафарычныя, вобразныя, узнёслыя вершы зборнікаў «Вечны Зніч», «Вочы Савы», «Нашэсце Поўні», вершы «новага тысячагоддзя», а таксама вянок паэтычных перакладаў — «галасоў з-за небакраю» ды ўзорныя эсэ — ураджайныя на шматасацыятыўнасць, арыгінальнасць і «паэтычныя парадоксы». Такія, як «Быць нататнікам Бога» (пра Рыгора Барадуліна), «Акно для матылькоў» (пра Янку Брыля), а таксама эсэйныя гімнаспевы пра Ніну Мацяш, Анатоля Вялюгіна, Рыгора Крушыну, Анатоля Сыса, Іну Снарскую, Юрку Голуба…

**Сяргей Дубавец. ЯК? Азбука паводзінаў. — Радыё Свабода, 2009. — 252 стар.**

Бадай, гэта найбольш «сістэмная» і гарманічная кніга аўтара, якая зніталася з журналістыкі (газета і радыё), творчасці (проза, эсэ) ды навуковасці (філасофія, псіхалогія, грамадазнаўства і пад.). Нацыянальная «Энцыклапедыя паводзінаў» прапануе адказы на тое, «як бараніцца і галасаваць, дараваць і любіць, сябраваць і хітраваць».

Атрымаўся двухбаковы падарунак на 50-гадовы юбілей аўтара — кніга, якая, паводле прызнання Аляксандра Лукашука, «замест дубовых запытаў «хто вінаваты?» і «што рабіць?» задае магічнае і музычнае, такое неістотнае і біблійнае, галоўнае для свабоды, вайны і кахання пытанне — «як?».

ЗНАХОДКА

# НЕВЯДОМЫ РАМАН АГАТЫ КРЫСЦІ

**Брытанскі таблоід The Daily Mail напрыканцы жніўня пачаў публікаваць раней невядомы твор каралевы дэтэктыва Агаты Крысці, які амаль 30 гадоў праляжаў на гарышчы яе загараднага дома. Галоўнымі героямі рамана з'яўляюцца легендарны дэтэктыў Эркюль Пуаро і Адольф Гітлер.**

Рукапіс знайшоў спецыяліст па творчасці пісьменніцы Джон Каррэн, якога ў 2005 годзе запрасілі разабраць паперы ў дэвонскай рэзідэнцыі Агаты Крысці. Пасля некалькіх гадоў карпатлівай працы ён аднавіў тэкст і ўстанавіў гісторыю стварэння рамана «Утаймаванне Цэрбера».

Гэты раман не мае ніякага дачынення да аднайменнага апавядання, апублікаванага ў 1947 годзе ў зборніку «Подзвігі Геракла». Арыгінальную версію «Утаймавання Цэрбера» Агата Крысці пачала пісаць яшчэ ў 30-х гадах мінулага стагоддзя. Але ў 1939 годзе выдаўцы адмовіліся ад публікацыі рамана.

На думку Каррэна, паступіць так выдаўцоў прымусіў палітычны складнік рамана. Рэч у тым, што арыгінальная версія «Утаймавання Цэрбера» мае ярка выяўленую палітычную скіраванасць, што ўвогуле для Агаты Крысці было вялікай рэдкасцю.

У прыватнасці, адным з асноўных персанажаў рамана, напісанага перад самым пачаткам Другой сусветнай вайны, стаў нейкі дыктатар, які відавочна нагадвае Адольфа Гітлера. Завуць гэтага героя Аўгуст Гертцляйн.

Як адзначае Daily Mail, у рамане Агата Крысці выяўляе наіўную надзею на тое, што гэты дыктатар можа быць звернуты ў хрысціянства і пачне прапаведаваць мір і каханне. У 30-я гады, адзначае выданне, насамрэч былі людзі, якія верылі ў гэта (напрыклад, амерыканскі рэлігійны прапаведнік Фрэнк Бухман).

Іншай незвычайнай дэталлю рамана, адзначае брытанская газета, сталі душэўныя перажыванні Эркюля Пуаро, выкліканыя жаночай прыгажосцю. У пачатку аповяду пісьменніца ўкладвае ў яго вусны фразу аб тым, што для гармоніі ў дадзены момант бракуе жанчыны…

Знакамітыя дэтэктыўныя раманы Агаты Крысці (1890-1976) перакладзеныя на 45 моў свету, а ў агульнай колькасці толькі на ангельскай мове прададзена больш мільярда асобнікаў. Па гэтым паказчыку яе пераўзыходзяць толькі Біблія і творы Шэкспіра.

Гэта не першы выпадак, калі невядомыя творы знакамітых пісьменнікаў публікуюць неспецыялізаваныя выданні. Так, увосень гэтага года ў часопісе Playboy упершыню будзе апублікаваны ўрывак з няскончанага рамана Уладзіміра Набокава The Original of Laura, які пісьменнік перад смерцю загадаў знішчыць. Нумар з фрагментам рамана паступіць у продаж 10 лістапада гэтага года — за тыдзень да пачатку афіцыйных продажаў кнігі.

У Расіі апошні раман У.Набокава выйдзе пасля амерыканскага і ангельскага выданняў.

**Паводле Newsru**

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by